ПАРТЫЗАНСКІ ДРУК ЯК ЧАСТКА РАДАВОДУ 5

НАРОДНЫ КАЛЯНДАР 8-9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 СТУДЗЕНЯ 2019 г. СУБОТА № 7 (28874)

ЛІЧБА ДНЯ

Каля 1 мільёна рублёў

матэрыяльнай дапамогі, абсталявання і падарункаў, паводле папярэдніх падлікаў, перадалі ў дзіцячыя ўстановы рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, дзяржарганізацыі, падпарадкаваныя ўраду, канцэрны, банкі, грамадскія аб'яднанні, уключаныя ў пералік удзельнікаў навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», паведамілі ў прэс -службе Міністэрства адукацыі. Рэспубліканская акцыя праходзіла з 10 снежня 2018 года да 11 студзеня 2019-га. Прадстаўнікі 91 арганізацыі наведалі 122 сацыяльна значныя аб'екты: школы-інтэрнаты, дзіцячыя дамы, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, дзіцячыя бальніцы, дзіцячыя сацыяльныя прытулкі, спецыяльныя вучэбна-выхаваўчыя ўстановы і інш. Усяго на рэспубліканскім узроўні ў дабрачынным мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 15 тысяч дзяцей.

КАРАТКА

• БРСМ рыхтуе стратэгію развіцця маладзёжнай арганізацыі на наступныя пяць гадоў.

• Пастаўскі малочны завод завяршыў рэалізацыю інвестпраекта па мадэрнізацыі цэха нарэзкі сыроў.

• Нацыянальны мастацкі музей прымеркаваў да свайго 80-годдзя выпуск абноўленай карты госця.

• Зімовы чэмпіянат па фотабёрдынгу ўпершыню пройдзе ў Беларусі 26 студзеня.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 19007>

ПАД КАЛЯДНЫМ БУКЛЕЕМ

Калі пад Новы год Іван ІЛЬЮЧЫК з вёскі Багданаўка Луніецкага раёна вяртаецца з працы (цяпер ён рамантуе фермы ў Нясвіжскім раёне), то дома абавязкова дастае свой буклей — адмысловую калядную зорку з батлеечнай інсталяцыяй. Ён ганарыцца, што яго аднавяскоўцы захавалі адзіны ў Беларусі абрад калядавання з буклеем. Яны па-ранейшаму ходзяць да сваякоў, суседзяў і сяброў, круцяць пад вокнамі зорку, віншуюць, спяваюць і весяляцца. Асаблівая радасць, калі да калядоўшчыкаў далучаюцца дзеці і ўнукі.

— Гэты буклей я захоўваю вельмі даўно, — кажа 58-гадовы паляншук Іван Ільючык. — Рамантую, выразаю з газет «кветусы» — так кажуць у Багданаўцы пра імітацыю махроў. Хочацца паказваць нашу традыцыйную рэліквію, ладзіць свята для сябе і для іншых!

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Спажывец

ЛАСУНКІ РУЧНОЙ РАБОТЫ

Хто гандлюе дамашняй выпечкай на рынку

Паўгода таму дамашнім кухарам і кандытарам дазволілі прадаваць сваю прадукцыю на рынках. Каб атрымаць месца за прылаўкам, дастаткова толькі зрабіць флюараграфію і заплаціць адзіны падатак. Здавалася б, спрошчаныя ўмовы павінны завабіць кулінараў на гандлёвыя рады. Але, як аказалася, такая магчымасць пакуль не карыстаецца папулярнасцю.

Новыя правілы дзейнічаюць з чэрвеня мінулага года. Згодна з пастановай Саўміна № 452, асобы, якія вырабляюць кандытарскія і хлебабулачныя вырабы без рэгістрацыі ІП, могуць гандляваць імі на рынку. Прычым без праходжання санітарна-ветэрынарнай экспертызы і дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку выпечкі. У сталіцы прадаваць ласункі кулінары могуць і на сельскагаспадарчых кірмашах на гарадскіх пляцоўках.

На Чыжоўскім рынку ў Мінску прадаўцоў з дамашнім печывам і цукеркамі не відаць. У адміністрацыі гандлёвага аб'екта расказваюць, што да іх за ўвесь час паступіў толькі адзін зварот па гэтым пытанні.

— Але чалавек нават не выстаўляўся. Прыйшоў, паглядзеў месца, напэўна, і перадумаў. Рынак сам па сабе невялікі, руху пакупнікоў тут асабліва няма, — называюць у адміністрацыі магчымую прычыну непапулярнасці месцаў за прылаўкам у кандытараў.

На рынак у Ждановічах за паўгода ніхто з дамашніх хлебапёкаў таксама не прыйшоў. «У нас зона гандлю прадуктамі ёсць толькі на вуліцы — не самыя зручныя ўмовы, каб прадаваць выпечку», — тлумачаць там.

СТАР. 4

З нагоды

Для аўтараў і чытачоў

Кніжная выстаўка будзе прысвечана Году малой радзімы і II Еўрапейскім гульням

XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш пройдзе з 6 да 10 лютага ў выставачным комплексе «БелЭкспа», што на праспекце Пераможцаў, 14. Сёлета кніжны форум мяркуецца прысвяціць Году малой радзімы і II Еўрапейскім гульням. Асаблівая ўвага будзе звернута і на юбілеі класікаў беларускай літаратуры, на памятныя гістарычныя даты нашай краіны.

Упершыню выстаўка пройдзе не толькі на пляцоўках выставачнага комплексу, але і ў кнігарнях, бібліятэках і музеях. Запланаваны літаратурныя экскурсіі і паэтычныя маршруты. Адбудуцца тэматычныя семінары, на якіх плануецца абмеркаваць сусветныя тэндэнцыі ў афармленні кніг, краўдфандынг (збор грошай на пэўны культурны праект праз інтэрнэт), літаратурную крытыку і блогінг, работу ў сацыяльных сетках, у тым ліку па папулярызацыі новых выданняў.

Як заўсёды, падчас выставы пройдуць сустрэчы з аўтарамі, выдаўцамі, мастакамі. Не абыдзецца кірмаш і без прэзентацый кніг, круглых сталоў, аўтограф-сесій выдатных пісьменнікаў, некаторыя з іх правядуць майстар-класы. Будзе працаваць і асобная дзіцячая пляцоўка.

Экспазіцыя «Друкарскі двор XVI стагоддзя» прадэманструе ўнікальную абстаноўку старадаўняй друкарні. Там, ужо традыцыйна, ахвотныя змогуць уласнымі рукамі надрукаваць старонкі кніг па старадаўняй тэхналогіі. І нават зрабіць паперу з ільну!

Як заўсёды, адна з ключавых падзей выстаўкі — міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». 6 і 7 лютага ў ім прымуць удзел аўтары з краін блізкага і далёкага замежжа. Таксама цікавасць выкліча семінар маладых літаратараў і перакладчыкаў.

На цэнтральнай пляцоўцы пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў 58-га нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» і конкурсу маладых літаратараў «Першацвет». А ганаровым госцем кніжнага форуму сёлета стануць Злучаныя Штаты Амерыкі.

Нагадаем, што ў кніжнай выстаўцы бяруць удзел як выдаўцы, так і кнігагандляры, вытворцы паліграфічнай прадукцыі. Тут традыцыйна не толькі набываюцца актуальныя кнігі, але і сустракаюцца даўнія сябры і падпісваюцца новыя дамовы.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ПРАЦАВІТЫМ І ТАЛЕНАВІТЫМ

Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды на ўрачыстым прыёме

Спачатку Прэзідэнт нагадаў прысутным пра гісторыю мерапрыемства. Яно пачалося шмат гадоў таму ў сувязі «з патрабаваннем нашых журналістаў». Тады ўрачыстасць адбылася за межамі Мінска, на прыродзе. Пазней падключыліся артысты, заявіўшы, што «без іх ніякага свята не бывае».

«Затым дзяржаўныя служачыя, нашы чыноўнікі кажуць — ну што ж, мы арганізоўваем гэтае мерапрыемства, а яно не наша? Такім чынам, далучыліся дзяржаўныя служачыя, а затым спартсмены і іншыя заслужаныя людзі Беларусі, якія прыносяць пашану і славу нашай дзяржаве», — распавёў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што гэта мерапрыемства праводзіцца напярэдадні старога Новага года. Ён дадаў, што ў гэты дзень мы не толькі выпраўляем мінулы год, але і спрабуем скрозь заслону жыццёвых клопатаў і бязладзіцы разгледзець 2019-ы.

Прэзідэнт заклікаў прысутных глядзець наперад і думаць пра жыццё — тады яно стане лепшым. Несумненна, варта аналізаваць памылкі мінулага, каб не рабіць іх на новым этапе.

«Смею дакладна сказаць, што для нашай краіны, для нашага народа не толькі 2019-ы, але і 2020 год будзе няпростым, — заявіў беларускі лідар. — Гэта няпростыя гады, таму што, скажу зноў жа адкрыта, у гэтыя два гады нас будуць вельмі моцна спрабаваць «на зуб», на прадмет, ці вартыя мы, калі канкрэтызаваць, той незалежнасці, пра якую мы заўсёды і ўсюды гаворым. І нам трэба быць гатовымі адказаць на гэтае пытанне, і я абсалютна перакананы, што мы знойдзем годны адказ».

Пры гэтым ён падкрэсліў: рашэнне праблем залежыць ад прысутных на прыёме, у ліку якіх і ўсё кіраўніцтва краіны. Дарэчы, асобна Аляксандр Лукашэнка спыніўся на спартсменах і назваў 2019-ы асаблівым для іх.

Акрамя таго, адметнай асаблівасцю ўсіх прысутных на мерапрыемстве Прэзідэнт назваў неабыякавасць. «Вы шчыра хварэеце за сваю справу, вы ўкладваеце ў яе душу, шчодра дзеліцеся назапашаным вопытам, сваім талентам. Удвая прыемна, што сярод нас тут шмат маладых. Тых, каму будаваць, берагчы, прадстаўляць на міжнароднай арэне нашу Радзіму заўтра», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён пажадаў прысутным, каб у іх заўсёды была надзейная апора — родныя і блізкія, якія з разуменнем ставяцца да іх нялёгкай, але ганаровай працы. Таксама беларускі лідар пажадаў усім натхнення, а яшчэ здароўя, дабра і міру.

На прыёме Прэзідэнт узнагародзіў міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея ордэнам Айчыны III ступені. Артыст Руслан Аляхно з рук беларускага лідара атрымаў медаль Францыска Скарыны.

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена шэрагу супрацоўнікаў СМІ. Таксама ганаровыя званні «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» і «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» атрымалі дзеячы культуры і спорту.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Знешняя палітыка

МАГЧЫМАСЦЬ ПАЛЯПШЭННЯ

Як паведаміў амерыканскі часопіс Foreign Policy, міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей у тэлефоннай размове з памочнікам дзяржаўнага сакратара ЗША па еўрапейскіх і еўразійскіх справах Ааранам Уэсам Мітчэлам 10 студзеня расказаў, што Беларусь зняла абмежаванні на колькасць дыпламатаў ЗША ў Мінску. Звесткі далі дзве крыніцы часопіса.

Нагадаем, з 2008 года амерыканскае пасольства ў Беларусі функцыянуе без пасла. Больш за тое, колькасць супрацоўнікаў першапачаткова была зменшана да пяці, аднак пазней ліміт павялічылі да дзесяці чалавек.

Дарэчы, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з памочнікам Ааранам Уэсам Мітчэлам у канцы кастрычніка мінулага года.

«Калі мы з вамі прасунемся ў нашых адносінах, я вам абяцаю, што беларусы ў вас будуць самымі надзейнымі, сумленнымі і шчырымі партнёрамі. Прынамсі, калі мы дамовімся, калі беларусы нешта вам паабяцаюць, нават у шкоду сабе, мы гэта выканаем», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка на той сустрэчы.

Міністэрства замежных спраў Беларусі пракаментавала БЕЛТА інфармацыю аб тэлефонных размовах паміж кіраўніцтвам ведамства і Дзяржаўнага дэпартамента ЗША. Начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі — **прэс-сакратар МЗС Беларусі Анатоль ГЛАЗ** расказаў наступнае:

«Мы можам пацвердзіць факт некалькіх тэлефонных размоў, якія адбыліся апошнім часам паміж кіраўніцтвам Міністэрства замежных спраў Беларусі і Дзяржаўнага дэпартамэнта ЗША».

Паводле яго слоў, падчас гэтых гутарак бакі абмяркоўвалі розныя аспекты беларуска-амерыканскіх адносін, у тым ліку магчымасць іх паляпшэння. Аднак згодна з правіламі дыпламатычнай этыкі дэталёвы змест гэтых размоў не выдаецца.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Улады Парыжа ў дзень акцыі «жоўтых камізэлек» выведуць на вуліцы бронетранспарцёры

Паліцыя Парыжа чакае правядзення шматлікіх акцый пратэсту «жоўтых камізэлек» сёння, 12 студзеня, у сувязі з чым на вуліцы французскай сталіцы будуць выведзены бронетранспарцёры. Пра гэта ў эфіры тэлеканала CNews заявіў начальнік паліцыі Парыжа Мішэль Дзельпеш.

«Мы чакаем больш сур'ёзных акцый пратэсту ў Парыжы 12 студзеня, чым у мінулую суботу, — адзначыў ён. — На вуліцах [для аховы парадку] будуць разгорнутыя 14 бронетранспарцёраў». Дзельпеш таксама паведаміў, што кантроль будзе арганізаваны на чыгуначных вакзалах і дарогах горада. Паводле яго слоў, рух з кожным разам становіцца ўсё больш радыкальным.

Раней тэлеканал BFM са спасылкай на прэм'ер-міністра краіны Эдуара Філіпа паведаміў, што ў краіне будзе мабілізавана 80 тысяч супрацоўнікаў праваахоўных органаў, пяць тысяч з іх — у Парыжы.

Па даных тэлеканала, найбольш буйныя акцыі пратэсту могуць адбыцца ў суботу ў Парыжы, Бардо, Марсэлі, Тулузе, Ліёне, Страсбургу.

Кааліцыя на чале з ЗША абвясціла аб пачатку вываду амерыканскіх войскаў з Сірыі

Пра гэта ў пятніцу паведаміла Agence France-Presse са спасылкай на афіцыйнага прадстаўніка штаба аперацыі «Непахісная рашучасць», якую праводзіць у Іраку і Сірыі група краін на чале з ЗША, палкоўніка амерыканскіх сухапутных войскаў Шона Раяна.

Раян пацвердзіў агенцтву, што кааліцыя «прыступіла да працэдуры выхаду з Сірыі». «З меркаванняў бяспекі мы не будзем гаварыць пра тэрміны, месцазнаходжанне і маршруты войскаў», — сказаў ён.

Немцы расказалі, турысты з якіх краін больш за ўсё раздражняюць іх на адпачынку

Грамадзяне Германіі прызналіся, што падчас адпачынку іх больш за ўсё раздражняюць турысты з Расіі і Вялікабрытаніі.

Расіяне атрымалі сярод грамадзян 12 краін найгоршыя ацэнкі. 60 % рэспандэнтаў заявілі, што турысты з РФ паводзяць сябе вельмі шумна, 56 % грамадзян ФРГ не падабаецца цяга расійскіх грамадзян да алкаголю падчас адпачынку. Яшчэ 38 % удзельнікаў даследавання лічаць, што рускія груба сябе вядуць, а 24 % не падабаецца звычка турыстаў з РФ рабіць сэлфі.

У брытанцах адпачывальнікаў-немцаў раздражняе, перш за ўсё, прыхільнасць да алкаголю (58 %). У прыватнасці, самалёты часта вымушаны здзяйсняць незапланаваныя пасадкі з-за п'яных насельнікаў Злучанага Каралеўства, піша Welt. Прычым, адзначае выданне, немцаў чамусьці так не раздражняюць натоўпы п'яных суайчыннікаў, напрыклад, на Мальёрцы.

Грамадзянам ФРГ не падабаецца таксама звычка брытанцаў загадзя займаць тапчаны на пляжах і каля басейнаў (37 %). Але 69 % рэспандэнтаў адзначылі, што суайчыннікі іх раздражняюць з-за гэтай звычкі яшчэ больш.

Еўрапейскія гульні — 2019

Пра допінг і здароўе

У Мінску прайшоў рэспубліканскі навучальны семінар «Пытанні медыцынскага і антыдопінгавага забеспячэння II Еўрапейскіх гульняў 2019 года»

У яго рамках спецыялісты разгледзелі шырокі спектр пытанняў медыцынскага забеспячэння, у тым ліку ключавыя патрабаванні да медыцынскага забеспячэння турніру, антыдопінгавую праграму Гульняў, падрыхтоўку арганізацый аховы здароўя і службы хуткай медыцынскай дапамогі, закупку медыцынскага абсталявання, вылучэнне медыцынскага персаналу.

Першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ адзначыў, што ўжо праведзена вялікая работа па арганізацыі медыцынскага і антыдопінгавага забеспячэння II Еўрапейскіх гульняў. *«Прапрацавана канцэпцыя расстаноўкі сіл і сродкаў, задзейнічання спецыялістаў спартыўнай медыцыны і ў цэлым спартыўнай галіны,* — расказаў ён. *— Ёсць новыя падыходы, якія заключаюцца ў тым, што будуць працаваць комплексныя брыгады па аказанні медыцынскай дапамогі спартсменам, а таксама гледачам на неспартыўных аб'ектах, у месцах пражывання. Чакаецца значны прыток замежных гасцей, аматараў спорту, таму планы мерапрыемстваў па медыцынскім забеспячэнні ўжо праходзяць дэталізацыю. Зараз мы пераходзім да трэнінгаў».*

Дзмітрый Піневіч таксама канкрэтызаваў планы па фарміраванні 50 змешаных медыцынскіх брыгад, якія будуць працаваць непасрэдна на спартыўных арэнах (у тым ліку і з гледачамі) і 50 брыгад хуткай медыцынскай дапамогі. Іх дзеянні будуць каардынавацца. Акрамя таго, па словах прадстаўніка Міністэрства аховы здароўя, запланавана павялічыць колькасць брыгад хуткай медыцынскай дапамогі, якія будуць працаваць у Мінску падчас Гульняў. Аднак ён адзначыў, што іх большая колькасць на форуме не адаб'ецца на якасці медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Акрамя таго, ствараюцца медпункты ў месцах правядзення спартыўных мерапрыемстваў, на трэніровачных аб'ектах, у міжнародным экіпіровачным і акрэдытацыйным цэнтрах, у месцах работы прадстаўнікоў СМІ і ў іншых аб'ектах. Плануецца, што некаторыя сталічныя ўстановы аховы здароўя будуць больш цесна інтэграваныя з Еўрапейскімі гульнямі, у прыватнасці РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, РНПЦ «Кардыялогія», РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, РНПЦ спорту, гарадская клінічная бальніца хуткай медыцынскай дапамогі, 2-я гарадская клінічная бальніца.

Першы намеснік міністра нагадаў пра запланаваны ўвод у строй у I квартале бягучага года паліклінікі ў Вёсцы спартсменаў, якая стане шматпрофільным медыцынскім цэнтрам на час Гульняў. *«Цэнтр ствараецца ў адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі па аказанні медыцынскай дапамогі атлетам у месцах пражывання спартсменаў. Зараз працягваем набываць абсталяванне. Асноўную ролю ў яго рабоце будуць адыграваць спецыялісты спартыўнай медыцыны. Уся інфраструктура, якая ствараецца для Гульняў, у далейшым будзе выкарыстоўвацца»,* — запэўніў Дзмітрый Піневіч.

Гаворачы аб антыдопінгавым забеспячэнні спаборніцтваў, ён адзначыў, што, асноўная маса допінг-афіцэраў будзе працаваць непасрэдна ў Вёсцы спартсменаў. Пры гэтым на кожным спартыўным аб'екце ёсць месцы для забору допінг-пробаў, якія адпавядаюць міжнародным патрабаванням.

Дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій КАТУЛІН адзначыў, што медыцынскае і антыдопінгавае забеспячэнне з'яўляецца адным з асноўных функцыянальных напрамкаў у падрыхтоўцы да такога буйнога мерапрыемства.

— Трэба разумець, што з пункту гледжання медыцынскага і антыдопінгавага забеспячэння мы будзем знаходзіцца пад пільнай увагай шэрагу структур, уключаючы зноў створаныя. Напрыклад, у галіне антыдопінгу — гэта міжнародная незалежная тэсціруючая арганізацыя, прадстаўнікі якой будуць працаваць на Гульнях. Акрамя таго, у нас будуць працаваць незалежныя аглядальнікі Сусветнага антыдопінгавага агенцтва, якія падалі запыт на магчымасць размяшчэння ў Вёсцы спартсменаў. Гэта робіцца для таго, каб быць у гушчы падзей і ажыццяўляць кантроль за працэсамі, якія іх цікавяць, — расказаў кіраўнік дырэкцыі.

Мяркуецца, што на мультыспартыўным форуме ў Мінску лік допінг-пробаў перавысіць адну тысячу. У некаторых відах спорту атлеты пройдуць гэтую працэдуру некалькі разоў.

Георгій Катулін таксама акцэнтаваў увагу, што спаборніцтвы будуць арганізаваны ў 23 дысцыплінах, прычым шэраг з іх — кантактныя і, такім чынам, траўманебяспечныя. Менавіта таму пытанне аказання дапамогі і больш хуткае аднаўленне з'яўляецца вызначальным і наўпрост уплывае на вынікі спартсменаў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Сугучча

Спазнаючы культурныя коды

Учора ў сталічнай кнігарні «Дружба» ва ўнісон гучалі беларуская і кітайская мовы — выдавецтва «Мастацкая літаратура» прэзентавала свае кніжныя праекты, прысвечаныя міжнароднаму культурнаму супрацоўніцтву, на адмысловай імпрэзе «Беларусь і Кітай: масты дружбы».

Дырэктар выдавецтва Алесь БАДАК нагадаў пра найбольш важныя і значныя праекты ў гэтым кірунку — выданне серыі кніг «Даследаванне кітайскай цывілізацыі», якое выходзіць у свет пры падтрымцы Рэспубліканскай Канфедэрацыі прадпрымальніцтва ў Кітаі, а таксама серыі «Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры», што рэалізуецца дзякуючы супрацоўніцтву беларускага боку з Пекінскім выдавецтвам па выкладанні і даследаванні замежных моў.

«Такія кнігі, якія папулярызуюць у даступнай форме навуковыя веды пра іншыя краіны, даюць беларусам, перадусім моладзі, магчымасць убачыць свет з розных бакоў, спасцігнуць іншыя культурныя коды, паспрабаваць зразумець сусвет і філасофію ўсходняй цывілізацыі, — падкрэсліла **рэдактар серыі «Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры» Паліна ГРЫНЧАНКА.** — А гэты сусвет сапраўды вельмі адрозны ад нашага — часам нават з дапамогай вопытных, прафесійных перакладчыкаў нам з цяжкасцю ўдавалася знайсці ў беларускай мове адпаведнікі тым рэчам і паняццям, якія для кітайцаў цалкам зразумелыя і натуральныя».

У серыі «Даследаванні кітайскай цывілізацыі» выйшлі ўжо кнігі, прысвечаныя кітайскай музыцы і каліграфіі, рыхтуюцца наступныя выданні, прысвечаныя міфалогіі і літаратуры. І ўжо тут, адзначаюць даследчыкі, паміж нашымі такімі рознымі культурамі назіраецца пэўнае падабенства: у прыватнасці, беражлівае стаўленне да традыцый і самабытнай гісторыі.

Таксама сёлета працягнецца выданне маштабнай міжнароднай серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая», якую Выдавецкі дом «Звязда» распачаў яшчэ ў 2014 годзе і ў якой беларускія паэты і перакладчыкі адкрываюць для шырокага кола чытачоў вялікіх кітайскіх паэтаў — класікаў і сучаснікаў. «Канешне, вельмі цяжка знайсці пункты судакранання, аднолькава зразумелыя для кітайскіх і беларускіх чытачоў, — зазначае **дырэктар міжнароднага радыё «Беларусь», паэт і перакладчык Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ,** — мабыць, найлепшым чынам дасягаюць адэкватнага перакладу не лінгвісты і даследчыкі мовы, а самі паэты, якія перадаюць не столькі словы, колькі вобразы і эмоцыі». А тое, што яны могуць быць зразумелымі нават без перакладу, прадэманстравалі вучні сталічнай гімназіі № 23, якія паралельна з рускай, беларускай і англійскай вывучаюць як другую замежную кітайскую — хлопцы прачыталі некалькі вершаў на мове арыгіналу.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Будзь у курсе!

МАГЧЫМАСЦІ БЕСКАНТАКТАВАГА ПРАЕЗДУ Ў МЕТРО ПАШЫРАНЫ

З 11 студзеня на турнікетах станцый Мінскага метро можна аплаціць праезд яшчэ і бескантактавымі банкаўскімі карткамі Белкарт-Maestro, паведамілі ў прэс-службе метрапалітэна.

Мінскі метрапалітэн сумесна з ААТ «БПС-Ашчадбанк», аплатнай сістэмай БелКарт і кампаніяй IBA Group пашырыў магчымасці аплаты праезду бескантактавымі банкаўскімі карткамі на турнікетах сталічнага метро. З 11 студзеня трымальнікам банкаўскіх картак аплатнай сістэмы БелКарт (банкаўскія карткі БелКарт-Maestro з бескантактавым інтэрфейсам) таксама дадзена магчымасць скарыстацца сэрвісам бескантактавых разлікаў за паездкі ў метро. Кошт праезду аналагічны цане жэтона.

Для аплаты праезду дастаткова паднесці банкаўскую картку да валідатара. Акрамя банкаўскай карткі, разлічвацца за праезд можна смартфонам ці іншым гаджэтам (бірулькамі, гадзіннікамі і іншымі прыладамі) з падтрымкай тэхналогіі NFC.

У прэс-службе звярнулі ўвагу пасажыраў на тое, што ў 2018 годзе партнёрамі метрапалітэна рэалізаваны механізм аб'яднання некалькіх паспяховых аплат праезду, здзейсненых на працягу 48 гадзін, у адну транзакцыю з адначасовым спісаннем з рахунку трымальніка карткі. На цяперашнім этапе максімальную колькасць аперацый, якія могуць агрэгавацца ў адну транзакцыю, — не больш за тры паспяховыя аплаты праезду. Зыходзячы з дзеючага тарыфу за праезд у метро 65 капеек, сума адной транзакцыі не перавышае 1 рубель 95 капеек.

Таксама нагадалі пасажырам, што, каб пазбегнуць непажаданага спісання грашовых сродкаў, неабходна прыкладваць да валідатара толькі тую картку, з дапамогай якой пасажыр жадае аплаціць праезд.

Пры неабходнасці атрымання дадатковай інфармацыі і электронных карт-чэкаў па здзейсненых плацяжах банкаўскай бескантактавай карткай на турнікетах метрапалітэна, можна звяртацца на партал paybaycard.by або ў Цэнтр падтрымкі кліентаў кампаніі IBA Group па тэлефоне: +375 17 217-39-50.

Карыстальнікі сэрвісу могуць адсочваць здзейсненыя паездкі, а таксама сумы аплаты па іх у асабістым кабінеце на сайце paybycard.by.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фінансы

ІНФЛЯЦЫЯ Ў 2018-М — 5,6 %

Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў снежні мінулага года ў параўнанні з лістападам склаў усяго 100,8 %, а са снежнем 2017 года — 105,6 %, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.

Спецыялісты Белстата ўдакладняюць, што базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, падлеглыя ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у снежні мінулага года ў параўнанні з лістападам склаў 100,3 %, са снежнем 2017-га — 104,8 %.

Эксперты таксама адзначылі, што за ўвесь мінулы год харчовыя тавары падаражэлі на 5,7 %, а цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 3,8 %. Індэкс спажывецкіх цэн на паслугі ў снежні склаў 101,2 % да лістапада 2018 года і 108,1 % да снежня 2017-га. Мэтавы параметр па інфляцыі на мінулы год — не больш за 6 %

Сяргей КУРКАЧ.

ЛІЧБАВЫ ОФІС САМААБСЛУГОЎВАННЯ

У Кобрыне адкрылі першае аддзяленне банка без супрацоўнікаў

Гэты філіял рэгіянальнай сеткі БПС-Ашчадбанка цяпер працуе па-асабліваму, — у ім няма звыклых касіраў і кансультантаў, а ўсе фінансавыя пытанні можна вырашыць праз шматфункцыянальны кіёск або тэрмінал.

Лічбавы офіс карэнным чынам адрозніваецца ад класічных аддзяленняў. У ім няма звыклых кас і рабочых месцаў, а амаль любую банкаўскую аперацыю можна здзейсніць самастойна. На першым этапе банкаўскія работнікі ўсё ж будуць побач. Яны дадуць кансультацыю і акажуць дапамогу ў наладжванні дыстанцыйных сэрвісаў. Як толькі людзі прывыкнуць — офіс пачне працаваць аўтаномна. Асабістыя кансультацыі таксама будуць магчымыя, дастаткова папярэдне ўдакладніць час сустрэчы з прадстаўніком банка.

«Для кліентаў важна мець доступ да новых тэхналогій. Такі запыт фіксуем не толькі ў жыхароў сталіцы, таму лагічна, што smart-праекты атрымліваюць развіццё і ў рэгіёнах. Лічбавы офіс у Кобрыне — гэта правобраз аддзялення будучыні, — растлумачыў **намеснік старшыні праўлення БПС-Ашчадбанка Алег БАРОДКА.** — Развіццё тэхналогій дазваляе кліентам большасць фінансавых аперацый здзяйсняць самастойна — як са смартфона або ноўтбука, так і праз тэрміналы і шматфункцыянальныя кіёскі».

Сяргей КУРКАЧ.

Крымінал, здарэнні

ДЫК ШТО ЗДАРЫЛАСЯ Ў ЛЕСЕ?

Навіна пра тое, што ў Талачынскім раёне знайшлі цела параненага — магчыма, жывёламі — мужчыны стала тэмай для абмеркавання ў інтэрнэце.

Вяскоўца ва ўзросце за пяцьдзясят гадоў, жыхара населенага пункта Сакалянка, з цялеснымі пашкоджаннямі знайшлі тутэйшыя жыхары. Інцыдэнт адбыўся яшчэ ў пачатку снежня.

— Упраўленнем Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці прызначаны комплекс судова-медыцынскіх экспертных даследаванняў, па выніках якіх будзе ўстаноўлена дакладная прычына смерці мужчыны, — паведамілі ў ведамстве.

Адназначна канстатаваць прычыну смерці, тым больш сцвярджаць, што чалавека пакусалі зверы, пакуль што рана.

Калі пасля судова-медыцынскай экспертызы будуць зроблены вывады, віцебскае ўпраўленне дасць канкрэтны адказ аб прычынах смерці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГОРА-РЭКЕЦІРЫ

Двое мінчан спрабавалі выбіць грошы з даўжніка, а ў выніку «зарабілі» крымінальную справу.

Як паведамілі ў Следчым камітэце, 30-гадовы мужчына і яго 26-гадовая сяброўка па просьбе свайго знаёмага вырашылі дапамагчы яму вярнуць доўг. Яны сустрэліся з даўжніком каля аднаго са сталічных супермаркетаў. Але дамовіцца «па-добраму» не ўдалося. Не прыдумаўшы нічога лепшага, маладая пара адабрала ў даўжніка мабільны тэлефон і запіхнула бедака ў аўтамабіль, пагражаючы фізічнай расправай. Прыехаўшы да гаража, які належаў дзяўчыне, абвінавачаныя паспрабавалі зацягнуць пацярпелага ў падвал. Але ў іх нічога не выйшла, паколькі даўжнік аказаў актыўнае супраціўленне.

Тады яны патэлефанавалі маці пацярпелага і запатрабавалі аддаць ім аўтамабіль коштам больш за сем тысяч рублёў, выказваючы пры гэтым пагрозы прымянення гвалту да яе сына. Аднак, не дабіўшыся свайго, яны пакінулі мужчыну каля гаража і з'ехалі.

Дзеянні выкрадальнікаў кваліфікаваны паводле ч. 1 арт. 183 (незаконнае пазбаўленне волі), ч. 2 арт. 206 (рабаванне), ч 2. арт. 208 (вымагальніцтва) Крымінальнага кодэкса Беларусі. Мужчына заключаны пад варту, а дзяўчына знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе.

Сяргей КУЛАКОЎ.

ПАЙШЛА Ў БАЛОТЫ І ЗНІКЛА

У цэнтр аператыўнага кіравання ратавальнікам Кобрынскага раённага аддзела МНС ад дзяжурнага РАУС паступіла паведамленне пра неабходнасць аказання дапамогі ў пошуку зніклага чалавека ў раёне вёскі Балоты.

Са слоў сваякоў жанчыны, 83-гадовая пенсіянерка, жыхарка вёскі Магдалін сышла ў вёску Балоты на пахаванне сваяка і прапала. Сувязі з ёй не было.

У пошуках заблукалай жанчыны ўдзельнічалі супрацоўнікі МНС, РАУС, валанцёры. Праз некалькі гадзін у лясным масіве, за 7 кіламетраў на поўдзень ад вёскі Балоты, жанчына была знойдзена ратавальнікамі. Бабулю агледзела брыгада хуткай медыцынскай дапамогі, ад шпіталізацыі яна адмовілася, паведамілі ў МНС.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фігурнае катанне

АНШЛАГУ БЫЦЬ!

На першынство кантынента па фігурным катанні ў Мінску прададзена 85 % білетаў

Аргкамітэт чэмпіянату Еўропы па фігурным катанні выпусціў у продаж дадатковыя месцы на тры заключныя дні мерапрыемства.

— Згодна з першапачатковым планам, мы павінны былі прадаць усе білеты на два асноўныя ўзроўні «Мінск-Арэны», ёмістасць якіх на кожны дзень складае каля дзевяці тысяч месцаў. План ужо выкананы па трох з пяці асноўных дзён чэмпіянату. Таму на іх — пятніцу, суботу, нядзелю — мы выпускаем дадатковыя білеты на верхні ярус арэны. На сераду і чацвер трыбуны запоўнены на 70 %, месцы на ніжніх узроўнях яшчэ ёсць. Сумарна ў нас цяпер прыкладна на 85 % ад планавага ўзроўню продажаў, і гэта вельмі добры вынік, — адзначае **Юлія КОМЛЕВА, старшыня Беларускага саюза канькабежцаў.**

Нагадаем, у рамках чэмпіянату Еўропы ў Мінск упершыню прыедуць вядучыя фігурысты кантынента і свету. Сярод іх алімпійская чэмпіёнка Аліна Загітава (Расія), двухразовы чэмпіён свету Хаўер Фернандэс (Іспанія), трохкратныя чэмпіёны свету Габрыэла Пападакіс/Гіём Сізэірон (Францыя) і іншыя.

Цырымонія адкрыцця чэмпіянату адбудзецца 23 студзеня. Спаборніцтвы будуць праходзіць з серады 23 студзеня да суботы 26 студзеня ўключна. 21 і 22 студзеня гледачы змогуць наведаць афіцыйныя трэніроўкі. Закрые чэмпіянат 27 студзеня гала-канцэрт з удзелам прызёраў спаборніцтваў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ЛАСУНКІ РУЧНОЙ РАБОТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для многіх кандытараў сапраўды больш зручна раскручваць свой тавар праз сацыяльныя сеткі. Знаёмая мінчанка, якая прадае праз Instagram цукеркі і пернікі ручной работы, падзялілася: дамашняя выпечка — дарагі тавар для рынку. «Заводскія коржыкі каштуюць па 50 капеек, а распісаныя пернікі — па чатыры рублі. Кантынгент, які ходзіць на рынак, не гатовы аддаваць такія грошы. Гэта вырашальны фактар. А ў сацыяльных сетках лёгка знайсці кліентаў, якія разумеюць, што яны плацяць за натуральны прадукт».

Між іншым на Камароўцы дамашнія кандытары перыядычна стаяць за прылаўкам.

— Ёсць два чалавекі, якія рэгулярна гандлююць. Яны прадаюць зефір і шакалад ручной работы, — даведваемся ад **начальніка службы арганізацыі рыначнага гандлю Камароўскага рынку Анжэлы БАРАНОВІЧ.** — Астатнія прыходзілі, спрабавалі, але не затрымліваліся. Сярод прадаўцоў былі і маладыя, і людзі старэйшага ўзросту.

Скаргаў ад наведвальнікаў наконт таго, што такая выпечка не праходзіць санітарных выпрабаванняў, не паступала.

— У пакупніка ёсць выбар. Калі ён сумняваецца, набываць яму ці не дамашнія пернікі, можна знайсці на рынку іншую прадукцыю на свой густ, — заўважае адміністрацыя.

Іна СЯМЁНАВА — адна з тых дамашніх кандытараў, якія пастаянна стаяць за прылаўкам на Камароўцы. Жанчына прадае зефір з паніжаным утрыманнем цукру з рознымі смакамі: вішні, маракуі, сыру дор блю. У асартыменце ёсць таксама зефір на фруктозе для дыябетыкаў. Вырабам слодычаў Іна займаецца два гады, а паспрабаваць прадаваць сваю прадукцыю на рынку вырашыла паўтара месяца таму. Сама яна жыве ў вёсцы Шчарбіны Мінскага раёна і ездзіць у сталіцу на маршрутцы.

— На шчасце, стратных дзён пакуль не было. Інтарэс з боку пакупнікоў ёсць, — адзначае. — Ці выгадна кандытару ісці за прылавак, залежыць ад таго, што ён пячэ. Распісаныя пернікі, якія цяжка вырабляюцца, а таму і каштуюць адпаведна, тут, вядома, складана будзе распрадаць. На свой тавар я стаўлю мінімальную нацэнку.

Упакоўка з трыма двайнымі зефіркамі ручной работы каштуе 2,5 рубля, каробка з васьмю штукамі — пяць рублёў. Тыя, што на фруктозе, крыху даражэйшыя.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Бабулі часам нават абураны такімі цэнамі, — усміхаецца жанчына. — Але моладзь ставіцца нармальна, разумее, што ручная работа павінна аплачвацца вышэй.

Асноўныя пакупнікі Іны — гараджане ад 20 да 30 гадоў. Прыходзяць да яе на рынак і тыя кліенты, які раней прасілі зрабіць слодыч на заказ: ім падабаецца, што ёсць магчымасць разгледзець асартымент і адразу на месцы набыць патрэбнае. А адной-чы дзённую партыю зефіру разабралі раней, чым кандытар дайшла да прылаўка. Адна з гарадскіх кавярняў шукала зефір для свайго мерапрыемства, злавіла Іну на ўваходзе на рынак і скупіла яе прадукцыю.

«Заводскія коржыкі каштуюць па 50 капеек, а распісаныя пернікі — па чатыры рублі. Кантынгент, які ходзіць на рынак, не гатовы аддаваць такія грошы. Гэта вырашальны фактар».

Побач з жанчынай — таблічка, дзе напісана, што якасць прадукцыі не пацверджана дакументамі. Такога абазначэння месцаў, дзе гандлююць дамашнія кулінары, патрабуюць правілы.

— Старэйшаму пакаленню не зусім зразумела: як так, без санстанцыі? Ім патрэбны гарантыі, упэўненасць, што гэта зроблена на вытворчасці. Таму пенсіянеры баяцца ў мяне купляць штосьці, але некаторыя, аднойчы пакаштаваўшы, бяруць. Як правіла, я ладжу дэгустацыю, бо без яе ніяк. Трэба, каб людзі адчулі розніцу: дамашні зефір не такі па смаку, як той, што ў краме.

Яшчэ адна выснова, якую Іна зрабіла, стоячы за прылаўкам, — калі хочаш выйсці ў плюс, на рынку трэба знаходзіцца амаль штодзень. Будзеш прыходзіць гандляваць раз на тыдзень — нічога не заробіш.

— Думаю, што буду карыстацца магчымасцю прадаваць свае вырабы на рынку. Тут жывыя стасункі, можна выстраіць сетку кантактаў, — падсумоўвае жанчына.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Калі хочаш выйсці ў плюс, на рынку трэба знаходзіцца амаль штодзень. Будзеш прыходзіць гандляваць раз на тыдзень — нічога не заробіш.

Прававая гасцёўня

Ільготы для прадпрымальнікаў-бацькоў

— Я шматдзетная маці і індывідуальны прадпрымальнік. Не так даўно ў мяне памёр муж. Ці маю я права на нейкія падатковыя прывілеі і льготы ў сувязі са стратай карміцеля?

Марына Н., *г. Быхаў.*

На пытанне адказвае Таццяна ЕРМАКОВІЧ, кансультант упраўлення прававога рэгулявання бюджэтна-фінансавых адносін і падаткаабкладання галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы эканомікі і экалогіі Міністэрства юстыцыі Беларусі:

— Падатковым заканадаўствам не прадугледжана магчымасць атрымання льгот у сувязі са стратай карміцеля. Усе пытанні, якія датычацца гэтых праваадносін, рэгулююцца заканадаўствам аб пенсійным забеспячэнні. Аднак у Падатковым кодэксе Рэспублікі Беларусь (далей — Кодэксе) утрымліваюцца палажэнні аб выплаце індывідуальнымі прадпрымальнікамі і іншымі фізічнымі асобамі адзінага падатку, а таксама пералічаны льготы па яго аплачванні.

Кодэксам вызначаны памеры базавых ставак адзінага падатку за месяц. Абласныя і Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў устанаўліваюць стаўкі адзінага падатку за месяц у межах базавых ставак у залежнасці ад умоў ажыццяўлення відаў дзейнасці.

Менш плаціць могуць, прынамсі, плацельшчыкі-бацькі (усынавіцелі) у шматдзетных сем'ях з трыма і больш дзецьмі ва ўзросце да 18 гадоў. Стаўкі адзінага падатку зніжаюцца на 20 % пачынаючы з месяца, які надыходзіць за месяцам, у якім узнікла права на льготу, уключаючы апошні дзень месяца, калі такое права згублена. Памяншэнне здзяйсняецца на падставе дакумента, які пацвярджае асобу, і пасведчання шматдзетнай сям'і.

Звяртаю вашу ўвагу, што згодна з Указам Прэзідэнта ад 19 верасня 2017 года № 338 «Аб падатковым кансультаванні», у адпаведных спецыялістаў можна атрымаць падатковыя кансультацыі. Так, у прыватнасці, да падатковых кансультантаў можна звярнуцца, каб атрымаць адказы па агульных пытаннях падаткаабкладання, а таксама параіцца наконт прымянення падатковага заканадаўства ў канкрэтнай сітуацыі з улікам абставін, якія склаліся ў асобы, якая звярнулася па кансультацыю. Акрамя таго, эксперты падрыхтуюць рэкамендацыі (заключэнні) па пытаннях падаткаабкладання, уключаючы вызначэнне аптымальных рашэнняў.

Азнаёміцца з Адзіным рэестрам падатковых кансультантаў можна на сайце Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць адказы.

Будзь у курсе!

РАБОТА ПРЫГАРАДНЫХ АЎТОБУСАЎ — НА ЎВЕСЬ ГОД

Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» абвясціла, як будзе арганізавана работа прыгарадных аўтобусаў у сувязі з пераносам рабочых дзён згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 906 ад 15.12.2018 «Аб пераносе рабочых дзён у 2019 годзе».

Так, яна цягам усяго года будзе запланавана па наступным графіку:

7 сакавіка — па графіку пятніцы; 8 сакавіка — па графіку суботы; 30 красавіка — па графіку пятніцы; 1 мая — па графіку нядзелі; 3 мая — па графіку чацвярга; 4 мая — па графіку пятніцы; 5 мая — па графіку суботы; 6 мая — па графіку нядзелі; 7 мая — па графіку нядзелі; 8 мая — па графіку нядзелі; 9 мая — па графіку нядзелі; 10 мая — па графіку чацвярга; 11 мая — па графіку пятніцы; 2 ліпеня — па графіку пятніцы; 3 ліпеня — па графіку нядзелі; 6 лістапада — па графіку пятніцы; 7 лістапада — па графіку нядзелі; 8 лістапада — па графіку нядзелі; 15 лістапада — па графіку чацвярга; 16 лістапада — па графіку пятніцы; 25 снежня — па графіку нядзелі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ОДО «Винный мир» (190235348, г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 128а, пом. 4, каб. 6), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

Дата и время проведения торгов: **12 февраля 2019 года**. Начало в 10.00, окончание в 12.00. Заявки принимаются с 12 января 2019 года по 11 февраля 2019 года.

Место проведения торгов: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ОДО «Винный мир» (УНП 190235348)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт».

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, руб	Шаг торгов	Задаток
1	Здание склада инв. № 730/С-12147, площадью 458 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Механизаторов	41 400,00 руб. без учета НДС (согласно подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)	5 %	5 %
2	Здание склада инв. № 730/С-12146, площадью 559,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Механизаторов	11 900,00 руб. без учета НДС (согласно подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ)	5 %	5 %
Местонахождение		Могилевская обл., г. Кричев, ул. Механизаторов		

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок по **11 февраля 2019 года** (за день до окончания) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460, в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация»;

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 11.02.2019 (за день до торгов) заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»;

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

– заявление подано только одним участником, либо не было подано ни одного заявления;

– на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Да 75-годдзя ВЫЗВАЛЕННЯ 1944 2019

Прачытаў — перадай другому *Сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі і газеты «Звязда»*

САКРЭТЫ СЯМЕЙНАГА АРХІВА

І мы кавалі перамогу...

Гэты загаловак я пазычыла з газеты «Шахцёр» 1995 года, у якой Павел Цвірко ўспамінаў пра падзеі, што адбываліся ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Павел Сцяпанавіч быў адным з арганізатараў падпольнай групы ў Грэскім раёне (сёння гэта тэрыторыя Случчыны), прымаў удзел у баявых аперацыях — у партызанскіх засадах, у многіх баях, у знішчэнні тэлефонна-тэлеграфнай сувязі.

Менавіта ён аднавіў выданне раённай газеты «Сталінец» у партызанскай зоне і да снежня 1943 года рэдагаваў яе, а пасля з-за пагаршэння здароўя перайшоў на пасаду намесніка рэдактара. Ім было падрыхтавана і напісана больш за сто лістовак і зваротаў да насельніцтва і асоб, якія трапілі на службу да немцаў. І ўсю гэтую працу ён вёў нягледзячы на цяжкую хваробу, вострыя эпілепсічныя прыпадкі...

А сёння яго праўнучка Даша Новікава, навучэнка 9 «Б» класа 23-й сталічнай гімназіі, вывучае старыя дакументы. Сямейную гісторыю і архіў яна выкарыстала ў сваёй навуковай рабоце, прысвечанай партызанскім газетам і лістоўкам. На конкурсе школьных даследчых работ, што праводзіўся ў Савецкім раёне Мінска, яе праект прызнаны найлепшым.

Мы вырашылі звязацца з Дашай і надрукаваць урыўкі з праекта, тым больш што яе прадзед пасля вайны працаваў уласным карэспандэнтам газеты «Звязда» па Баранавіцкай вобласці (захавалася пасведчанне, выдадзенае Паўлу Сцяпанавічу ў 1945 годзе). Да таго ж і сама Даша марыць пра прафесію журналіста...

СПАДЧЫНА ПАДПОЛЬШЧЫКА

Родныя Паўла Сцяпанавіча змаглі зберагчы архіў, які ён старанна збіраў. Амаль цалкам захавалася падшыўка газеты «Сталінец» за 1944 год, а таксама лістоўкі і звароты, успаміны былых калег па падполлі, характарыстыка на члена КПСС, якую выдалі Паўлу Цвірко, і нават даведка, што ён прайшоў спецправерку пры ўпраўленні спецлагера № 174 (праз такую «працэдуру» прапускалі людзей, якія падчас вайны знаходзіліся на акупаванай тэрыторыі).

У сямейным архіве захаваліся і старыя фотаздымкі, адзін з іх зроблены за тыдзень да пачатку Вялікай Айчыннай. У гэты час Павел Цвірко быў малодшым палітруком, праходзіў курсы ў Смаленскай вобласці і ўжо тады ведаў, што вайна непазбежная...

— Дзед плённа працаваў з рознымі дакументамі, — расказвае маці Дашы, Надзея Цвірко. — На жаль, дзядулі не стала, калі мне было 17 гадоў. Не так многа я паспела пачуць пра вайну ад яго, ды ён і не любіў пра яе расказваць, магчыма таму, што ў гэты час страціў сваіх родных — нацысты забілі яго бацькоў, сястру з маленькім дзіцем, сям'ю дзядзькі, спалілі разам з жыхарамі родную вёску Адамова. А вось бабуля, якая ў вайну працавала сувязной і распаўсюджвала партызанскі друк, расказвала пра жахі вайны. Яна ўспамінала, як падчас адной з аблаў, калі партызаны ўцякалі ад карнікаў, прасіла прыстрэліць яе, бо проста не было больш сіл ісці...

Дашын праект стаў найлепшым на раённым конкурсе даследчых работ школьнікаў.

Партызаны друкавалі лістоўкі нават на нацысцкіх бланках. На адваротным баку можна ўбачыць свастыку.

«ПРОПУСК» ДА ПАРТЫЗАНАЎ

Разглядаем сямейны архіў разам з Дашай. Асабліва дзяўчынку зацікавілі звароты, якія партызаны пісалі да тых, хто служыў у паліцыі, дзе ў канцы пазначана: «Гэту лістоўку пры пераходзе да партызан паказвай разам са зброяй». Пацвярджэнне таму, што падобная друкаваная прадукцыя сапраўды давала эфект, знаходзім у падшыўцы газеты «Сталінец». Тут багата заметак, аўтары якіх дзеляцца, што пад прымусам былі загнаныя на службу да немцаў, але змаглі ўцячы і змагаюцца за вызваленне Беларусі.

Заўважаем, што супрацоўнікі друкарні «Сталінец» пускалі ў справу ўсё, чым удавалася разжыцца — асобныя звароты, набраныя на тонкай абгортачнай паперы, на шпалерах і нават на нямецкіх бланках (на адваротным баку можна ўбачыць фрагмент нямецкай свастыкі). Тут ёсць у тым ліку і фальшывы «Загад віцэ-прэзідэнта Беларускай Цэнтральнай Рады» — жартаўлівы адказ партызан на стварэнне прафашысцкай арганізацыі. Таксама ў падпольнай друкарні быў набраны зварот да працоўных Грэскага раёна, дзе выкрываецца нямецкая прапаганда: «У фашысцкім падбрэхічы «Газэта Случчыны» ад 13 лютага 1944 года змешчана брахня нямецкага халуя «прэзідэнта» Астроўскага. Гэты здраднік беларускага народа... гаварыў, што «немцы дапусцілі вялікія памылкі, спальваючы вёскі і забіваючы людзей. Але гэта больш не паўторыцца» — заявіў ён.

Пасля вайны Павел Цвірко працаваў у «Звяздзе».

Пасля гэтага загаду... нямецкія злачынцы разам з бобікамі 29 лютага ўварваліся ў вёску Краснае Палікараўскага сельсавета і спалілі яе дашчэнту. Такія ж самыя «нявінныя памылкі» былі зроблены з многімі вёскамі Слуцкага раёна, якія былі спалены, а жыхары знішчаны».

На старонках газеты «Сталінец» можна знайсці інфармацыю і пра іншыя злачынствы нацыстаў. Таксама знаходзім тут верш Максіма Танка і зварот да моладзі Кандрата Крапівы. Багата матэрыялаў пра баявыя дзеянні партызанаў. А яшчэ са старых газет можна даведацца пра тое, як вызваляліся населеныя пункты Беларусі, як яны аднаўляліся.

— Не боязна было брацца за такую складаную тэму, як «падпольны друк», пераглядаць вялікую колькасць матэрыялаў? — цікаўлюся ў Дашы.

— Мяне падтрымлівала мая настаўніца гісторыі Алена Барысаўна Пірагова. І працаваць было вельмі цікава. Мяне гэтая тэма глыбока закранула, калі я стала вывучаць яе не па старонках падручнікаў, а па сямейных дакументах і гісторыі жыцця майго прадзеда і прабабкі. Я шмат ведала пра вайну з заняткаў па гісторыі і літаратуры, але ў асноўным у школе мы вывучаем інфармацыю пра баявыя дзеянні і не асэнсоўваем да канца значнасць, боль, жах і гераізм тых часоў. Напрыклад, раней я не ведала пра работу падпольных груп: як усё там было прадумана, зладжана працавала, людзі з розных груп дзейнічалі аўтаномна, нічога не ведалі пра сваіх калег. Па ўспамінах майго прадзеда, у ліпені 1941 года ён прайшоў у Гомелі трохтыднёвыя курсы падпольшчыкаў і ў жніўні быў накіраваны ў тыл ворага, на радзіму ў Грэск. Пры падтрымцы іншых мясцовых камуністаў ён арганізаваў Грэскую партыйна-камсамольскую групу ў складзе 25 чалавек. Падполле сфарміравалася па ўсіх правілах канспірацыі. Група была разбіта на тры падгрупы, і ў кожнай мелася свая справа. У склад адной падгрупы ўваходзілі медыцынскія работнікі Грэскай бальніцы. Яны забяспечвалі падпольшчыкаў лекамі, лячылі параненых партызан. Другая група займалася разведвальнай дзейнасцю. Яе ўдзельнікі працавалі ў мясцовай управе немцаў і мелі доступ да сакрэтных звестак. На трэцюю былі ўскладзены абавязкі па інфармацыйна-палітычнай рабоце. У далейшым я хацела б заняцца гісторыяй Першай сусветнай вайны. Недалёка ад вёскі Нагорнае, адкуль родам мая бабуля, ёсць пахаванне салдат, пра якіх ніхто не згадвае. Трэба выпраўляць становішча...

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота Андрэя САЗОНАВА.

Захавалася фота, зробленае за тыдзень да пачатку Вялікай Айчыннай.

На ідэалагічным фронце

Газета «Сталінец» — орган Грэскага раённага камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі — была заснавана яшчэ ў мірны час у 1935 годзе. Да вайны Павел Цвірко працаваў тут літаратурным работнікам, а пасля і адказным рэдактарам. Выданне «Сталінца» было адноўлена ў падполлі ў чэрвені 1943 года. Газета выходзіла да моманту вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 года. Не магу сабе ўявіць, як у тых найскладанейшых умовах, амаль кожны дзень гледзячы ў твар смерці, супрацоўнікі газеты здолелі забяспечыць яе штотыднёвы выхад. Увогуле ў падполлі быў надрукаваны 31 нумар у 1943-м і 36 — у 1944 годзе. Наладзіць масавы выпуск газет на тэрыторыі, якую кантралюе вораг, — справа не з лёгкіх. На дапамогу прыйшлі «суседзі» — Слуцкая падпольная група на чале з А. Д. Фаміным. Са Слуцка ў партызанскую друкарню былі дастаўлены шрыфты, мастыка і папера.

Друкаванае слова ў гэты час было ідэалагічнай зброяй як з боку савецкай улады, так і з боку нацысцкай Германіі, асабліва на акупаваных тэрыторыях, дзе насельніцтву было цяжка атрымліваць інфармацыю аб рэальным становішчы на фронце, чым і карысталіся захопнікі. Нацысты былі добрымі спецыялістамі ў сферы дэзынфармацыі, вялі ў Беларусі масіраваную прапаганду. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны з самалётаў раскідваліся нямецкія лістоўкі. У іх сцвярджалася, што вайна вядзецца не супраць савецкага народа, а супраць бальшавізму. Да таго ж на тэрыторыі Беларусі выдавалася каля 37 фашысцкіх газет і часопісаў. Так, у Грэску і Слуцку распаўсюджвалася «Газэта Случчыны», якая заклікала: «Беларусы, уключайцеся ў адзіны эўрапэйскі фронт барацьбы супраць бальшавізму і плютакратыі — гэтых ворагаў цывілізацыі і культуры!»

З першых дзён акупацыі БССР савецкія падпольныя газеты, у тым ліку і «Сталінец», супрацьстаялі падобным выданням і нямецкай прапагандзе. Падпольны друк стаў асноўнай крыніцай дакладнай аператыўнай інфармацыі аб падзеях на франтах, што ўзмацняла патрыятычныя настроі жыхароў акупаваных тэрыторый і давала ўпэўненасць у перамозе, садзейнічала пашырэнню партызанскага руху і прытоку патрыётаў у шэрагі народных мсціўцаў.

Дар'я НОВІКАВА.

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Буда-Кашалёўскі раён

БУДА-КАШАЛЁВА БУДЗЕ ПРЫГАЖЭЦЬ

Летась у сельскагаспадарчым Буда-Кашалёўскім раёне было намалочана 43,5 тысячы тон збожжа кукурузы, што ў два разы больш за ўзровень 2017 года. Ураджай каласавых збожжавых склаў амаль 74 тысячы тон, рапсу — наблізіўся да 3,8 тысячы тон. Кармоў было нарыхтавана амаль 250 тысяч тон. Старшыня Буда-Кашалёўскага райвыканкама Андрэй ГАРБАЧОЎ адзначае, што за гэтымі лічбамі стаіць штодзённая, карпатлівая праца кіраўнікоў гаспадарак, механізатараў, жывёлаводаў:

— Вынікі сведчаць, што людзі навучыліся эфектыўна працаваць на зямлі нават без наяўнасці спрыяльных пагодных умоў. Па выніках работы за мінулы год сельскагаспадарчымі арганізацыямі Буда-Кашалёўскага раёна выкананы паказчык па тэмпе росту вытворчасці валавой прадукцыі. Цяпер у пяці гаспадарках Буда-Кашалёўшчыны праведзена значная работа па абнаўленні тэхнічнай базы і рэканструкцыі жывёлагадоўчых аб'ектаў. Напрыклад, ААТ «Гомельскі хімічны завод» пабудаваў траншэі для захоўвання сіласу агульнай ёмістасцю 10 тысяч тон у МТФ «Папаратнае» філіяла «Марозавічы-Агра».

— Андрэй Аляксеевіч, апошнім часам райцэнтр набыў сучасны выгляд. Работы ў гэтым кірунку працягваюцца?

— Пастаянна ажыццяўляецца капітальны рамонт жыллёвага фонду, праводзіцца добраўпарадкаванне дарог і гарадскіх вуліц. Так, летась Буда-Кашалёўскім ДРБУ-184 выкананы рамонтныя работы на многіх аўтадарогах мясцовага значэння. Завершана работа па рэканструкцыі моста цераз раку Хачэмля.

Ёсць пэўныя поспехі ў будаўнічай галіне. У райцэнтры ў верасні быў уведзены ў эксплуатацыю 40-кватэрны жылы дом агульнай плошчай 2086 квадратных метраў. У сакавіку плануецца пачаць будаўніцтва 60-кватэрнага жылога дома. За кошт дзяржаўнай падтрымкі крэдыты атрымалі 11 шматдзетных сем'яў. Дамы для іх пабудуюць у розных населеных пунктах раёна, а таксама ў мікрараёне «Маладзёжны» Буда-Кашалёва.

— Відаць, на 2019 год вызначаны напружаныя заданні ва ўсіх сферах сацыяльна-эканамічнага развіцця...

— Асноўная задача кіраўніцтва раёна — гэта паляпшэнне жыцця яго насельніцтва, забеспячэнне сярэдняй заработнай платы ў памеры, адпаведным 500 даларам ЗША. Для гэтага трэба сканцэнтраваць сваю ўвагу на павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці, рацыянальным выкарыстанні абаротных сродкаў, рэалізацыі прадукцыі, у тым ліку на экспарт. Нам трэба павышаць эфектыўнасць работы прадпрыемстваў, ствараць новыя рабочыя месцы. Сумеснымі намаганнямі мы зробім наш раён яшчэ прыгажэйшым і ўпішам у яго гісторыю шмат новых выдатных старонак. Нас усіх аб'ядноўвае тое, што сваю плённую працу, веды і энергію мы накіроўваем на ўмацаванне прэстыжу Буда-Кашалёўскага раёна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Гісторыя:

Першая згадка пра вёску Буда-Кашалёўскай воласці ў дакументах адносіцца да 1824 года. У той час тут пражывалі дзяржаўныя сяляне. Імклівы рост паселішча пачаўся ў апошняй чвэрці XIX стагоддзя, калі тут была пабудавана станцыя Лібава-Роменскай чыгункі. Будаўніцтва магістралі спрыяла развіццю прамысловасці і рамёстваў, асабліва ў галіне лесаперапрацоўкі. Узоры буда-кашалёўскага дубу выстаўляліся нават на сусветных выстаўках у Парыжы.

Буда-Кашалёўскі раён заснаваны ў 1924 годзе ў складзе Бабруйскай акругі. У 1938 годзе Буда-Кашалёва атрымала афіцыйны статус гарадскога пасёлка, а ў 1971-м — горада.

Насельніцтва раёна цяпер складае больш за 29 тысяч чалавек. У райцэнтры пражывае 8,5 тысячы жыхароў.

Дасягненні:

За мінулы год навучэнцамі школ Буда-Кашалёўскага раёна заваявана 8 дыпломаў у інтэлектуальных, больш за 50 — у творчых конкурсах. На правах пераможцы 2018 года раён у новым 2018/2019 навучальным годзе прымае абласны дзіцячы конкурс інтэлектуалаў «ДЗЕТКІ».

Летась на базе сярэдняй школы № 1 Буда-Кашалёва адкрыты спецыялізаваны спартыўны клас. Школьнікі займаюцца вольнай барацьбой і лёгкай атлетыкай.

У мінулым годзе падрыхтавана пяць кандыдатаў у майстры спорту.

*** Галоўныя дасягненні Буда-Кашалёўскага раёна ў галіне камунальнай гаспадаркі — своечасовае выкананне двух даручэнняў Прэзідэнта. У верасні 2018 года аднавілі і ўладкавалі пешаходны пераход цераз чыгунку ў райцэнтры. А сучасны лазневы комплекс плошчай 300 квадратных метраў стаў падарункам да Новага года.**

ДОБРЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ — ДОБРЫ ЗАРОБАК

ААТ «Юбілейны-Агра» — адзін з лідараў аграпрамысловага комплексу Буда-Кашалёўскага раёна. Спецыялізацыя прадпрыемства — вырошчванне збожжавых, зернебабовых і кармавых культур, а таксама вытворчасць малака і мяса. Тут робяць стаўку на ўкараненне прагрэсіўных тэхналогій і павышэнне эфектыўнасці земляў. Дарэчы, агульная зямельная плошча складае больш як 8,5 тысячы га сельгасугоддзяў.

Пагодныя ўмовы летась адмоўна паўплывалі на канчатковыя вынікі сельскагаспадарчага года. У ААТ «Юбілейны-Агра» валавы збор збожжавых і зернебабовых культур склаў 7776 тон пры сярэдняй ураджайнасці 20,9 ц/га. Пры гэтым гаспадарка выйшла ў раённыя лідары па нарыхтоўцы кармоў. Менавіта «Юбілейны-Агра» летась стаў пераможцам раённага спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур, нарыхтоўцы травяных кармоў. Гэта было адзначана на раённых «Дажынках».

У гаспадарцы на ўмоўную галаву жывёлы на зімоўку назапашана па 37 цэнтнераў кармавых адзінак. Умацоўваць кармавую базу тут пачалі адначасова з павелічэннем пагалоўя жывёл. За апошнія тры гады яго колькасць павялічылася на дзве тысячы галоў і сёння складае звыш пяці тысяч.

— Для забеспячэння жывёлы якаснымі кармамі мы сваімі сіламі пабудавалі сіласна-сянажную траншэю на 10 тысяч тон, — расказвае **дырэктар ААТ «Юбілейны-Агра» Васіль РУДЗЕНКА.** — Таксама пабудавалі сарай для вырошчвання маладняка, паколькі мы будзем і надалей павялічваць пагалоўе статка. Валавы надой за 2018 год склаў 6678 тон пры ўдоі на карову 5071 кілаграм. План па вытворчасці малака мы выканалі на 104,7 %. Рэнтабельнасць вытворчасці малака склала 9,7 %.

Сёння на тэрыторыі гаспадаркі — дзве малочнатаварныя фермы і даільна-малочны блок. Планавая мадэрнізацыя жывёлагадоўчых аб'ектаў і абнаўленне абсталявання дазваляюць павялічваць аб'ёмы вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі і паляпшаць яе якасць. Летась тут рэканструявалі памяшканне для ўтрымання маладняку на МТФ «Негаўка» і арачнік для ўтрымання маладняку на ДМБ «Негаўка».

На прадпрыемстве многа робіцца для паляпшэння ўмоў працы і адпачынку ў структурных падраздзяленнях. На МТФ «Негаўка», МТФ «Ліпінічы», ДМБ «Негаўка» абсталяваны душавыя, гардэробныя, туалеты, пакоі адпачынку, прыёму ежы з мікрахвалёвымі печамі і электрачайнікамі. На МТП «Негаўка» ёсць лазня і душавы пакой, пакой прыёму ежы. Ва ўсіх структурных падраздзяленнях гаспадаркі ўсталяваны апараты для награвання вады. Работнікі забяспечаны спецадзеннем.

На сённяшні дзень у гаспадарцы па размеркаванні працуюць шэсць маладых спецыялістаў, тры пасля адпрацоўкі працягваюць працаваць на прадпрыемстве.

Сямейны экіпаж Алег и Іван ПРУС.

Дырэктар ААТ «Юбілейны-Агра» Васіль РУДЗЕНКА гаворыць, што пакуль застаецца пэўны дэфіцыт высокакваліфікаваных кадраў:

— Не хапае інжынераў і жывёлаводаў. У нас сёння ёсць вакансіі галоўнага інжынера і галоўнага заатэхніка. Мы шукаем спецыялістаў, якім гарантавана абяцаем заробак у 1000 рублёў. Дадаткова можна зарабіць яшчэ каля 600 — за выкананне асобных аперацый.

Між тым, каб прыцягнуць і замацаваць размеркаваных на працу маладых спецыялістаў, на прадпрыемстве выдзяляюцца не толькі пад'ёмныя ў памеры аднаго службовага акладу, але і ўсталёўваецца павышэнне тарыфнай стаўкі да 50 %, даецца дадатковы заахвочвальны адпачынак да трох каляндарных дзён, аплачваюцца адпачынак, звязаны з далейшым навучаннем, і выдаткі, звязаныя з найманнем жылля. Таксама аказваецца аднаразовая матэрыяльная дапамога ў памеры пяці базавых велічынь тым юнакам, што вярнуліся пасля армейскай службы на ранейшае месца працы.

Ва ўсіх структурных падраздзяленнях ААТ «Юбілейны-Агра» праводзіцца работа па добраўпарадкаванні. Перыядычна — касметычны рамонт памяшканняў і своечасовае абкошванне пустазелля на ўсёй тэрыторыі прадпрыемства. Сумесна з прафсаюзным камітэтам і членамі першаснай арганізацыі БРСМ работнікі прадпрыемства ўдзельнічаюць у суботніках на падведамаснай тэрыторыі.

Адміністрацыя гаспадаркі аддае вялікую ўвагу арганізацыі вольнага часу сваіх супрацоўнікаў. Для заняткаў фізкультурай тут абсталявана трэнажорная зала, ёсць сталы для гульні ў тэніс і більярд, якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў супрацоўнікоў гаспадаркі і жыхароў найбліжэйшых населеных пунктаў. Сфарміравана каманда па футболе, а для яе ўдзельнікаў набыты форма і інвентар. Дарэчы, каманда заняла другое месца ў раённым спаборніцтве па футболе. Супрацоўнікі гаспадаркі ў раённых спаборніцтвах па

Малады спецыяліст — ветурач Марына КАСЦЮЧЭНКА.

гіравым спорце занялі трэцяе месца. У дартсе каманда стала трэцяй, а ў спаборніцтвах па більярдзе заняла другое месца.

У ААТ «Юбілейны-Агра» клапоцяцца пра тое, каб кожны работнік адчуваў сябе неад'емнай паўнапраўнай часцінкай калектыву, свядома імкнуўся выконваць свае грамадзянскія і прафесійныя абавязкі. Прадпрыемства зацікаўлена ва ўзаемавыгадных партнёрскіх адносінах ва ўсіх кірунках сваёй дзейнасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

УНП 491476895

КУРС — НА ДАКЛАДНАЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА

Рэспубліканскае даччынае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Беларуснафта-Асобіна», якое ўваходзіць у склад вытворчага аб'яднання «Беларуснафта» — самы буйны вытворца мяса птушкі ў Гомельскай вобласці.

Прадукцыя добра вядомая спажыўцам сваёй высокай якасцю, а брэнд «Смачная птушка» карыстаецца папулярнасцю не толькі на Гомельшчыне, але і ў іншых абласцях Беларусі і за яе межамі. На прадпрыемстве працуе цэх паглыбленай перапрацоўкі мяса птушкі магутнасцю 5 тон у змену. На сённяшні дзень у гандлёвай сетцы прадстаўлена больш за 200 найменняў прадукцыі.

Гандлёвая марка «Асобіна» — гэта шырокі асартымент прадуктаў з ахалоджанага мяса: кураняты бройлеры, распрацоўванне рознай ступені перапрацоўкі (кумпячкі, галёнкі, крылцы, фаршы і іншае), а таксама натуральныя прадукты з мяса са спецыямі ў розных марынадах (шашлыкі, барбекю), шырокі асартымент варана-вэнджаных вырабаў з мяса птушкі.

Каўбасныя вырабы, сасіскі, сардэлькі, вэнджаніна гандлёвай маркі «Асобіна» вылучаюцца натуральным смакам, вырабляюцца толькі з ахалоджанага мяса, якое дазваляе захаваць у прадукце самыя важныя мікраэлементы і пажыўныя рэчывы, неабходныя арганізму чалавека.

Плошча, якую займаюць землі і вытворчыя аб'екты сельскагаспадарчага прызначэння, складае каля 10 500 гектараў. Землі тут цалкам выкарыстоўваюцца для забеспячэння асноўнай вытворчасці якасным кормам. Для гэтага сканцэнтраваліся на вырошчванні пшаніцы і кукурузы. Менавіта гэтыя культуры — аснова ідэальнага корму для птушкі.

Намеснік дырэктара па сельскай гаспадарцы Мікалай ДОЛІЧ гаворыць, што ў 2018 годзе ў першую чаргу за кошт кукурузы атрымалася дасягнуць максімальнага для прадпрыемства выхаду валавой вытворчасці збожжа:

— Пры тым, што пасяўныя плошчы пад кукурузу ў нас паменшыліся амаль на тысячу гектараў, яе валавы збор значна вырас. Для параўнання: калі ў 2017 годзе было намалочана 17 000 тон, то летась — 25 700. У нас традыцыйна падводзяцца вынікі па зборы ўраджаю з улікам сабранага зерня кукурузы. Мы летась дадаткова атрымалі 4 тысячы тон зерня да ўзроўню папярэдняга года. Прыемна, што наш экіпаж механізатараў быў адзначаны на абласных «Дажынках». Менавіта дзякуючы самаадданасці нашых механізатараў і ўсяго калектыву прадпрыемства дасягнула станоўчых вынікаў.

Сёння патрэба птушкафабрыкі «Беларуснафта-Асобіна» ў зерні складае 72 тысячы тон у год. З той зямлі, што ёсць у прадпрыемства, у самыя спрыяльныя гады збіраюць палову ад неабходнай колькасці збожжавых для вытворчасці корму для птушкі. Магутнасці прадпрыемства такія вялікія, што астатняе даводзіцца закупляць.

— Удасканальванне тэхналогій апрацоўкі глебы прыносіць пэўныя вынікі, але ж вытворчасць трэба павялічыць мінімум у два разы, — вызначае задачы Мікалай Доліч. — У нас сёння склалася надзейная агратэхнічная тэхналогія. Часткова, на асобных, лёгкіх па сваім складзе землях, мы пачалі выкарыстоўваць метад безадвальнай апрацоўкі глебы. Гэта важна з эканамічнага пункту гледжання, а яшчэ і таму, што не парушаецца мікрафлора. Апошнім часам шмат увагі ўдзяляем кантролю за работай механізатараў. Цяпер пачалі шчыльна займацца дакладным земляробствам. Гэта такая сістэма кіравання прадукцыйнасцю пасеваў, заснаваная на выкарыстанні комплексу спадарожнікавых і камп'ютарных тэхналогій. Замест таго, каб араць, сеяць, уносіць угнаенні прыблізна, як гэта рабілася звычайна, сёння можна вельмі дакладна разлічыць колькасць насення, угнаенняў і іншых рэсурсаў для кожнага ўчастка поля. Урэшце такі падыход дазволіць зменшыць выдаткі і павялічыць аддачу зямлі. Пакуль мы ўкаранілі першую частку такой сістэмы. У нас усе трактары абсталяваны GPS-навігацыяй. Гэта дазваляе ў рэжыме рэальнага часу сачыць за кожнай машынай: з якой хуткасцю рухаецца, якія аперацыі выконвае, як выконвае, які расход паліва, як працуе рухавік, ці ёсць парушэнні пры сяўбе ці апрацоўцы глебы...

Каб падрабязна азнаёміцца з новымі агратэхнічнымі тэхналогіямі, спецыялісты прадпрыемства выязджалі на Міншчыну, у агракамбінат «Ждановічы». Там вывучалі арганізацыю сістэмы працы па дакладным земляробстве. Мікалай Доліч кажа, што пры ўкараненні такой тэхналогіі ў тым ліку некалькі лягчэйшай стане праца механізатараў:

— Мяркуецца, што пры новай навігацыйнай сістэме, якая дзейнічае праз спадарожнік, машына зможа практычна самастойна, без умяшальніцтва механізатара, рухацца па полі. У нас ёсць праграма, згодна з якой будзем вырашаць праблему з вытворчасцю збожжавых культур — у першую чаргу за кошт павышэння ўраджайнасці. Запланавалі шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на абнаўленне машынна-трактарнага парка. Плануем закупіць машыны для ўнясення мінеральных угнаенняў, дыскавыя бароны, рознаглыбінныя культыватары і энерганасычаны трактар. Таксама будзем купляць высокапрадукцыйныя агрэгаты для сяўбы збожжавых і кукурузы.

На прадпрыемстве «Беларуснафта-Асобіна» сёння робяць асноўную стаўку на развіццё, таму інвестуюць сродкі ў мадэрнізацыю вытворчасці і заўсёды гатовы да інавацый.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

УНП 490420663

Аляксандр Панкоў і Дзяніс Філіпаў на камбайне КЗС-1218 «Палессе» ўбралі 760 гектараў з умоўным намалотам 1673 тоны і занялі трэцяе месца на Гомельшчыне. Да таго ж у раённым спаборніцтве механізатары «Беларуснафта-Асобіна» занялі практычна ўвесь п'едэстал — восем супрацоўнікаў атрымалі заслужаныя ўзнагароды. У тым ліку лідарам у раёне прызнаны маладзёжны экіпаж у складзе Андрэя ГУСАРАВА і Аляксандра ПІНЬКОЎСКАГА.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІЯ ДУБРОВЫ — ГОНАР БЕЛАРУСІ

— Асаблівую каштоўнасць дзяржаўнага біялагічнага заказніка «Буда-Кашалёўскі», які створаны 35 гадоў таму, уяўляюць дубровы, — расказвае дырэктар Буда-Кашалёўскага доследнага лясгаса Сяргей ЛОЗКА. — Там растуць самыя высокапрадукцыйныя, высакаякасныя і ўстойлівыя насаджэнні дубоў, якія выкарыстоўваюцца для збору насення і далейшага развядзення.

Два самыя вялізныя дубы-волаты, узрост якіх каля 350 гадоў, з'яўляюцца помнікамі прыроды рэспубліканскага значэння. З іх збіраюць жалуды, якія высяваюцца ў гадавальнікі, і потым — на лесакультурныя плошчы. Вялікія масівы ў раёне займаюць дубровы, створаныя яшчэ ў пасляваенны час.

— Увогуле ж, — кажа Сяргей Мікалаевіч, — калі штогод мы высякаем дрэвы на плошчы 120—140 гектараў, то аб'ём пасадак складае 600—650 гектараў. Лесааднаўленне адбываецца на тых плошчах, якія выходзяць з-пад вырубак, а таксама на нізкабальных землях, якія выведзены з сельгасабароту і перададзены ў дзяржлясфонд. За 15 гадоў мы прынялі 17 тысяч гектараў такіх зямель. Калі ў 90-я гады плошча нашага лясгаса была 35 тысяч гектараў, то сёння — большая за 50. За год было засвоена інвестыцый у асноўны капітал на суму Br1350 тысяч.

У Буда-Кашалёўскім лясгасе пастаянна вядзецца работа па абнаўленні машынна-трактарнага парка. За апошнія два гады набыта шмат неабходнай тэхнікі, адзначае дырэктар прадпрыемства:

— Прагрэс ідзе наперад, цяжкую фізічную і часам небяспечную працу трэба замяняць дасканалымі механізмамі. Таму патрэбна самая сучасная тэхніка. Мы набылі два новыя харвестары, МАЗы для дастаўкі драўніны і іншую тэхніку. Таксама машыны для падвозкі рабочых у кожнае лясніцтва і трактары для тралёўкі драўніны. Для аховы лясоў кожнае лясніцтва атрымала па новым пазадарожніку.

Цяпер на трох пажарна-наглядальных вежах у лясніцтвах установлены сістэмы відэаназірання. Яны дазваляюць аглядаць усю тэрыторыю лясгаса і значна аблягчаюць сачэнне за лесам у сітуацыі пажарнай небяспекі. Дзяжурны ляснік-аператар бачыць на маніторы ўсё, што адбываецца ў наваколлі. У 2018 годзе ў лясгасе былі пачаты работы па будаўніцтве ангара для рамонту буйнагабарытнай тэхнікі.

— Былыя майстэрні нам ужо не падыходзяць, — разважае Сяргей Мікалаевіч. — Бо тэхніка, якую рамантуем, значна змянілася. У 2019 годзе плануем правесці рэканструкцыю гадавальніка — ажыццявіць падвядзенне туды вады і электрычнасці. Будзем займацца і рэканструкцыяй адміністрацыйнага будынка Буда-Кашалёўскага лясніцтва. У найбліжэйшыя гады паступова абновім будынкі яшчэ двух лясніцтваў нашага лясгаса. Сярэдні заробак у нас апошнім часам значна вырас. Па выніках мінулага года ён складае 950 рублёў. Трэба, каб і далей ён павялічваўся. Таму важна думаць пра далейшае развіццё.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Гістарычная даведка:

Упершыню лясы Кашалёўскай лясной дачы згадваюцца ў 1503 годзе ў перапісцы паміж польскім каралём Аляксандрам I Ягелончыкам і вялікім маскоўскім князем Іванам III Васільевічам.

У XVII—XVIII стагоддзях на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна размяшчаліся фальваркі, пры якіх вяліся лесанарыхтоўкі, лесапілаванне, перапрацоўка драўніны на вугаль, паташ, смалу, дзёгаць.

Попыт на мясцовы лес узрос з пачаткам будаўніцтва расійскага флоту на Чорным моры. У XIX стагоддзі ў гэтых мясцінах самым буйным быў дзяржаўны маёнтак Кашалёўскае старасты. Тут вялася актыўная распрацоўка масіваў карабельнага і будаўнічага лесу.

У 60-х гадах XIX стагоддзя новы штуршок для пашырэння нарыхтоўкі і спажывання драўніны дало будаўніцтва шашы Санкт-Пецярбург — Кіеў і Лібава-Роменскай чыгункі. Да пачатку XX стагоддзя на тэрыторыі цяперашняга Буда-Кашалёўскага раёна працавала 5 лесапільных заводаў.

Пастановай Савета Народных Камісараў СССР ад 2 чэрвеня 1936 года на базе Буда-Кашалёўскага леспрамгаса быў арганізаваны Буда-Кашалёўскі лясгас.

*** Статус доследнага абавязвае Буда-Кашалёўскі лясгас да цеснага супрацоўніцтва з навукай. Аднаўленне поймавых дуброў з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў, а яшчэ спецыялістамі Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі тут ствараюцца культуры лістоўніцы еўрапейскай, аксаміту амурскага, арэха маньчжурскага і іншых відаў нетрадыцыйных для краіны дрэў.**

*** Харвестар — гэта спецыяльная шматфункцыянальная машына, якая выкарыстоўваецца пры здабычы і першаснай апрацоўцы дрэва (валка, абразанне сукоў і распілоўка).**

УНП 400054225

Беларускі народны каляндар на 2019 год

НАРОДНЫ КАЛЯНДАР — гэта сістэма рухомых і сталых свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, звычаяў, што замацаваны ў фальклоры. Уяўляе пераважна спалучэнне язычніцкай і хрысціянскай культур. Гэта фальклорны каляндар: ён складзены на аснове хранонімаў, якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў, і ўключае традыцыйныя арыенціры на сельскагаспадарчыя работы і адпачынкі ў гадавым, сезонным, месячным і іншых цыклах-рытмах. Сістэматызаваны беларускі народны каляндар у складзе з велікодна-валачобнымі песнямі, якія ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць традыцыйныя прысвяткі і святы, у тым ліку тыя, што закансерваваліся ў непараўнальных паэтычных узорах як Навагоддзі/Навалецці, з'яўляецца нашым шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры.

У народным календары на 2019 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, прымаўкамі, урыўкамі з валачобных песень і г. д. Дні (хранонімы), якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам. Зорачкай /*/ пазначаны святы «рухомай» царкоўнай пасхаліі.

Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля. Даўжыня дня і моманты ўсходу і захаду ў дні сонцастаянняў і раўнадзенстваў падаюцца для Мінска. Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у кнізе Алеся Лозкі «Беларускі народны каляндар».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Студзень

П	А	С	Ч	П	С	Н
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

Люты

П	А	С	Ч	П	С	Н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28			

Сакавік

П	А	С	Ч	П	С	Н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

Красавік

П	А	С	Ч	П	С	Н
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30					

Май

П	А	С	Ч	П	С	Н
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31		

Чэрвень

П	А	С	Ч	П	С	Н
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30

Ліпень

П	А	С	Ч	П	С	Н
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30	31				

Жнівень

П	А	С	Ч	П	С	Н
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25
26	27	28	29	30	31	

Верасень

П	А	С	Ч	П	С	Н
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30						

Кастрычнік

П	А	С	Ч	П	С	Н
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

Лістапад

П	А	С	Ч	П	С	Н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	

Снежань

П	А	С	Ч	П	С	Н
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30	31					

Студзень

1. а. Новы год. ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 годзе.

6. н. Першая, Посная куцця. Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. *Богаз'яўленне, Тры Каралі.* Католікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі», або «Гэроды».

7. п. Раство Хрыстова. Пачатак **Каляд.** «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...». Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку. На Каляды праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і інш.).

9. с. Сцяпан. Дзень найму слуг, батракоў у мінулым. «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».

13. н. Шчодрая куцця. Пачатак **Шчодрага тыдня.** «Мароз, хадзі куццю есці».

14. п. Васілле. Новы год па праваслаўным календары. «Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю».

18. пт. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця. Апошнія дні Каляд. «Каляда ад'язджае».

19. сб. Вадохрышча (Кшчэнне). «Святое Кшчэнне ваду ксціла..., свет ачысціла і ваду наверх пусціла», «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».

20. н. Прывадохрышча — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

24. ч. *Аксіння.* «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». **Фядос.** «На Фядоса цёпла».

25. пт. Таццяна. Свята студэнтаў. *Павел.* «Вее вецер — будзе вайна».

31. ч. Апанас, Гусінае свята. Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».

Люты

1. пт. *Ігнат.* «На Святога Ігната зіма багата».

2. сб. *Грамніцы, Стрэчанне.* «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца».

5. а. *Агата.* Каровіна свята. «Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты».

6. с. *Дарота.* «Па Дароце высахнуць хусты на плоце». **Паўзіміца Аксіння.** «На Аксіні мяце».

11. п. Ігнат. «Ігнат Грамніцам рад».

14. ч. *Валянцін.* Свята закаханых. **Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя».

15. пт. Грамніцы, Стрэчанне. «Зіма з летам сустракалася, пра здароўейка пыталася», «На Грамніцы палавіна зіміцы».

18. п. Агата.

24. н. *Памінальніца. Канец Памінальнага тыдня. Калі «вея» ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі «дзесяцінкі дзве». *Мацей.* «На Мацея дарога пацее», «На Мацея адліга — будзе мароз». **Улассе.** Свята жывёлы. «Аўлас на сыры лас».

25. п. *Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны тыдзень. Тыдзень перад Масленіцай. Дзяўчаты вешалі «калодкі» нежанатым хлопцам.

26. а. Фаціння. Заступніца ад хвароб.

Сакавік

1. пт. *Дзедава пятніца.

2. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы). «Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі».

4. п. *Казімір.* «Святы Казімір дровы сякець». Пачатак **Масленага** тыдня. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Ілы сеялі лён.

6. с. **Серада Папяльцовая* (пач. Вялікага посту ў каталікаў).***Лысая серада.** Праталінызалысіны.

7. ч. *Блакітны чацвер. Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. «На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі».

9. сб. Янка, Паўраценне. Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

10. н. *Масленіца. «Масленіца ў «вятху» (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку». ***Гуканне вясны.** «Блаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці». На Палессі вадзілі карагоды, «спявалі чырачку», насілі ёлку з вянком.

11. п. *Паласказуб. Першы дзень Вялікага посту. Паласкалі зубы гарэлкаю.

12. а. *Рыгор.* «На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».

13. с. *Уступная серада. Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і пераскоквалі цераз пень. **Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.

14. ч. Аўдоцця Вясноўка. Гуканне вясны. «На Аўдокі голы бокі». (1.03 Новы год у мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль). «Святы Еўдакей... пераступ года».

15. пт. Хвядот. «На Хвядота занос — усё сена знясе».

16. сб. *Зборава субота. Абрад «споведзі дзежкі».

17. н. *Зборніца, Ізбор. Адзін з варыянтаў Новага года/лета ў час прыняцця юліянскага летаслічэння. «Святы Ізбор упярод ступіць». Пачатак збору ў поле. **Герасім Гракоўнік.** «Герасім гракоў прыгнаў».

18. п. *Веснавое раўнадзенства. Усход — 07.18, захад — 19.18.*

19. а. *Язэп.* «Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту». «На Язэпа пагода — год ураджайны».

22. пт. Саракі. Было Новым годам/летам. «Святыя Саракі наперад пайшлі». Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. «Святыя Саракі ў поле саху валаклі». **Прыска.** «На святога Прыску праб'е лёд і пліска».

25. п. *Дабравешчанне, Звеставанне.* «І птушка гнязда не кладзе». Прылёт бусла. Гуканне вясны. Было Новым годам. «Перша свята — нова летца, Благавешчан зямлю сушыць». **Рыгор.** «На Рыгора зіма ідзе ў мора».

26. а. Міжблагавешчыны (да 7 красавіка). Забарона на «запасванне» кароў.

30. сб. Аляксей Цёплы. Дзень рыбалова. «На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою».

31. н. Палікарп. Пачатак бясхлебіцы.

Красавік

1. п. *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі «храсты». Засеўкі. Абрад «жаніцьбы коміна». **Дар'я Вясенняя.** Адбельвалі палотны.

3. с. *Серадапосце. Выпякалі «храстцы».

5. пт. *Арына.* «На Арыну сей капусту ў расадніках».

6. сб. Камаедзіца. Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі «буславы лапы».

7. н. Благавешчанне. «Благавешчанне без ластавак — халоднае лета». Абрад «Страла».

8. п. Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** «Дзікая качка яйцом пахваліцца». **Благуста.** «На Благусту сей капусту».

9. а. Матрона. «На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае».

12. пт. *Пахвальная пятніца. Мыццё дзежак.

13. сб. *Пахвальная субота. Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў.

14. н. **Пальмова нядзеля.* «Вярба б'е, не я б'ю». **Прабуджэнне хатніка.** У гэты дзень хлусілі, каб заблытаць хатніка. «Апрэль — нікому не вер». **Мар'я.** Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

15. п. Пачатак ***Вербнага тыдня.**

16. а. Мікіта. «Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам».

21. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ (у каталікаў). ***Вербніца. Руф.** Руф рушыць снягі.

22. п. Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце.

23. а. *Чысты аўторак. Каб на людзей і «гаўядо» не напала «парша», трэба ўсё мыць. **Юры.** (Новы год па задыяку). «Першае святца — святы Юр'я», «Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на «голы» лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла». **Войцах.** «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху».

24. с. *Дравяная страсць. Мыюць усё дравяное. **Анціп** — ахоўнік зубоў.

25. ч. *Чысты чацвер. Ідуць у лазню. Абрад мыцця дзежкі. *Марк.* «Дождж на Марка, дык зямля як шкварка».

26. пт. *Чырвоная, Велікодная, пятніца. Сеялі гарох.

27. сб. *Вялікая, Чырвоная, субота. Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту.

28. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ. «Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!». Быў Новым годам. «Першае свята — свята Вялікадня». **Пуд.** «Пуд снег пугне».

29. п. Працяг ***Велікоднага тыдня.** «Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць». **Арына.** «На Арыну сей капусту».

30. а. Зосім — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

Май (Травень)

1. с. *Градавая серада. Праводны, Мёртвы, тыдзень. «Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула». **Кузьма.** «Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком».

2. ч. *Людавы дзень. Раней у Віленскай губерні білі і качалі яйкі з лубкоў, гушкаліся на арэлях. ***Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўскі чацвер).** Дзень памінання на могілках. Хлопцы і дзяўчаты аблівaліся вадою.

3. пт. *Прашчэнне. Аблівaліся вадою.

5. н. *Праводная нядзеля. «Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла». **Ляльнік.** Свята Лялі — дачкі Лады.

6. п. *Радаўнічныя Дзяды. Юр'е. Свята жывёлы. «Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня». Абрад «Страла».

7. а. *Радаўніца. «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць». **Алісей.** «Прыйшоў Алісей — авёс пасей». **Бабскія розбрыкі.** Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

8. с. *Станіслаў.* «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава». **Марк.** «Дождж на святога Марка — дык зямля, як шкварка». **Ярылавіца.** Свята Ярылы.

12. н. *Міраносцы. «На Міраносця п'яныі бабы цігаюць адна адну за валосця».

13. п. Якуб. «На Якуба грэе люба».

14. а. Макарэй. Абрады ля вады.

15. с. Барыс. Апякун поля і жывёлы.

18. сб. Арына Расадніца. Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

20. п. Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага, тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві. **Антоній.** «На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца, дык і прадасца».

21. а. Іван Веснавы. Апякун земляроба. «На Івана каласок, а на Пятра піражок».

22. с. *Градавая, Пераплаўная, серада. Засцярогі ад граду і дажджу. **Мікола Веснавы.** Свята пастухоў. *Алёна.* «Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена».

23. ч. Зілот. «Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злата».

24. пт. Макей. «Мокра на Макея — і лета не прасушыць». **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокра.

25. пт. Епіфан. «На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета».

27. п. Сідары. «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы».

28. а. Пахом. «Святы Пахом павее цяплом». «Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом».

29. с. *Магдалена.* Зязюльку прысылае.

30. ч. **Ушэсце.* Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта.

31. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень (Віленская губ.). *Божае цела, Зелянок. **Шэсць дзеў.** «Лён сей позні». **Канапелька Матруна.** «У зямлю махнула». Фядот. «Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка».

Чэрвень

2. н. Тры пакутнікі. «Няма лета, але пасля іх не бывае зімы».

3. п. Алёна, Ульяна. Дзень ільну.

4. а. Васіліск. «Ад Васіліска і салавей бліскa».

5. с. Дзень Ефрасінні Полацкай. Хадзілі ў Полацк пакланіцца і абракацца.

6. ч. *Ушэсце. Абрад «Страла».

7. пт. Ян. «Рой перад Янам — пчаляр будзе панам».

9. н. **Сёмуха, Зялёныя святкі, Святы Дух.* Свята зелені. «На Духа будзе цёпла і суха».

12. с. *Градавая серада.

13. ч. Ерамей. *Антоній.* «Антоні, аддай коні».

14. пт. *Сёмушныя Дзяды. Юстын і Харытон.

15. сб. *Духавая субота, Зялёная субота.

16. н. *Сёмуха, Тройца. Культ продкаў і раслiннасці. «Павядзём Куста пад гай зялёненькі...». **Лук'ян**. Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

17. п. *Русальніца, Іван ды Мар'я. Правадзіны вясны. «На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...».

18. а. *Конскі Вялікдзень. Свята коней.

19. с. *Градабой, Серада Русаль. Здабывалі з ясеня святы агонь. *Летняе сонцастаянне. Усход — 04.37, захад — 21.44. Даўжыня дня — 17.07 гадзін (таксама — з 17 па 23.06).*

20. ч. **Божае цела.* ***Наўская Тройца, Аблiваха.** Памінанне.

21. пт. Тодар.

22. сб. Кірыла. Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

23. н. *Русальчыны розыгрыш. Засцерагаліся рос. ***Пятроўскія запускі.** Развівалі вянкі. *Купала.* У старажытнасці — Новы год/лета.

24. п. *Пятроўка (Петравіца) Пятроўскі пост да 11 ліпеня. Пятроўка-галадоўка. *Ян Купальны.* «Сонца грае».

25. а. Анапрэй. «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ».

26. с. Акуліна Грачышніца. Сеялі грэчку. **Задзярыхвост.**

27. ч. *Дзявятнік. Перавод уніятаў у праваслаўе. «Дзеўяць ягодзін на ветцы».

28. пт. *Дзевятуха. Дзень засцеражэння ад навальніцы. **Амос.** «Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс»

29. сб. Ціхан. «Пеўчыя птушкі заціхаюць». *Пятрок.* «Да Пятра зязюльцы кукаваці», «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два».

Ліпень

4. ч. *Дзясятнік. «Дзесятнік гнаі возіць».

5. пт. *Дзясятка. «Косы точыць», «Жыта паспявае».

6. сб. Купалле. Свята Сонца і кахання. «Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне».

7. н. Іван Купала. «Учора была Купала, а сёння Іван».

10. с. Самсон. «На Самсона дождж — сем тыдняў то ж». *Сем братоў.* «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды».

12. пт. Пятро. Свята заканчэння Купалля.

13. сб. Паўпятро. Дзень талакі. **Сымон і Юда.** «На Сымана й Юды конь баіцца груды».

14. н. Кузьма і Дзям'ян. Свята кавалёў. «Святы Пятро жыта спеліць, св. Кузьма сярпы робіць, а св. Дзям'ян сена грабе».

17. с. Андрэй. «Авёс у свiтцы, а на грэчцы і кашулі няма». «Андрэй усіх мудрэй».

18. ч. Свята Месяца. «Месяц гуляе».

21. н. *Данат.* «Святы Данат коскі точыць». **Казанская. Пракоп.** Пракоп бок прыпёк.

25. ч. *Якуб.* «На Якуба хлеба поўна губа». **Прокл.** Засцерагаліся вялікіх рос.

26. пт. *Ганна.* Снапы кладзе. **Серпавіца, Шыпілінка** (пятніца перад Іллёю). Дзень «зазубрывання» сярпоў перад жнівом. **Гаўрылей.** Засцеражэнне ад граду.

29. п. Афінаген. Заціхаюць птушкі.

Жнівень

1. ч. Макрыны. «Глядзі восень па Макрыні».

2. пт. Ілля. Свята дажджоў і навальніц. «Ілля нарабіў гнілля», «Укінуў у воду кусок ільда».

4. н. Мар'я. «Магдалена — вады па калена».

6. а. Барыс. Палікоп. «Барыс і Глеб — паспеў хлеб».

7. с. Ганны. «Святы Ганны бабкі стаўляюць».

9. пт. Панцеляймон. Сцаляў ад хвароб галавы.

10. сб. *Лаўрын.* «На Лаўрына спяшай да млына».

12. п. Сіла. Жыта сей.

14. с. Макавей, Першы Спас. Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 27 жніўня.

15. ч. *Прачыстая, Зельная.* «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста». **Базыль.** «Базыль авечкам воўну дае».

16. пт. Антоны Віхравеі. Рох. «Кірмаш на паненак» — дзень выглядання нявест.

17. сб. Еўдакія. Агуркі збірае.

19. п. Яблычны Спас. Свята садавіны.

23. пт. Лаўрэн — свята млынара.

24. сб. *Баўтрамей.* «Св. Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей». «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».

27. а. Міхей. Выспяваюць брусніцы.

28. с. Прачыстая. Свята ўраджаю.

29. ч. Трэці Спас. Свята хлеба. **Ян.** «Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў».

30. пт. Міроны Ветрагоны. «Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць».

31. сб. Флор і Лаўр. Свята коней. **Арабінавыя дзень і ноч.** «Сухая» навальніца, або дождж.

Верасень

5. ч. Лупа. «Сей на Лупа — будзе жыта купа».

7. сб. Баўтрамей. «Жыта на зіму сей».

8. н. *Другая Прачыстая.* «Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».

10. а. Мацей. Абаронца ад п'янства.

11. с. Калінавік, Іван Крываўнік.

13. пт. Кіпрыян. Журавель збіраецца ў вырай.

14. сб. *Узвіжанне.* Закрыванне зямлі. **Сымон.** Абрад «жаніцьбы коміна». (Асенняе Навалецце/Навагоддзе з 1493 г.). **Бабіна лета.**

19. ч. Цуды, Міхал. «Міхал з поля спіхаў».

21. сб. Багач, Нараджэнне Божае Маці. Свята заканчэння ўборкі зерневых. Засідкі.

24. а. Тадора. «На Тадору ўсякае лета заканчваецца».

26. ч. Стаўроўскія Дзяды. *Асенняе раўнадзенства. Усход — 07.02, захад — 19.00.*

27. пт. Звіжанне. Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі — у кучу.

29. н. *Міхал.* «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі». Сіцыян. «Святы Сацыян ды ляны пасцілаў»

Кастрычнік

2. с. Зосім. Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

3. ч. Астап, Астаф'я. Прыкметы па ветру.

4. пт. *Пранцішак, Пранцішак.* «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

8. а. Сяргей. Жалезны тыдзень.

9. с. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў. Шапталіся свахі пра нявест.

14. п. Пакровы, Трэцяя Прачыстая. Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам». «Пакровы — зарыкалі каровы». **Дзявоцкае лета** (па 21.10). Прымалі «ў дзеўкі» сяброваў.

21. п. Трыфан, Палагея. «Золкім ветрам вее». *Зміцер.*

25. пт. Марцін — свята млынароў.

28. п. *Сымон і Юда.* «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць». *Параскева Пятніцкая.* Забарона на прадзенне.

29. а. Лонгін. Збавіцель ад хвароб вачэй.

30. с. Паклоны. Дзень адбівання паклонаў.

31. ч. Лука. «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Дзень іканапісцаў. *Юльян* — ахоўнік дзяцей.

Лістапад

1. пт. *Усе святыя.*

2. сб. *Задушны дзень.* Памінальны дзень. **Асяніны, Змітраўскія Дзяды.** «Святыя дзяды, завём вас...»

4. п. Казанская. «Да Казанскай — не зіма, а пасля — не восень; зранку дождж, з вечара — снег. Выязджай на Казанскую на калёсах, а палазы з сабой прыхапі».

8. пт. Зміцер. «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

9. сб. *Тодар.* «На Тадора поўна камора».

10. н. Параскі. Апякунка жанчын і рукадзелля.

11. п. Настуся. Настуся стрыжэ авечкі. *Марцін.* «Мядзведзь кладзецца ў бярлогу».

12. а. Артошка. Пачатак прадзення.

14. ч. Кузьма-Дзям'ян. Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

21. ч. Міхайлаў дзень. Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

22. пт. Матрона. «З Матроны становіцца зіма».

24. н. Хвёдар Студзянец. «Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

25. п. *Кацярыны.* «Кацярына забрала лета». **Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў.

27. с. Юстыніян. Апякун плоднасці і дзяцінства. **Піліп.** Пярэдадзень Піліпоўскага посту (да 7 студзеня).

28. ч. Піліпаўка — перадкалядны пост (да 06.01).

29. пт. Мацей. «На Мацея зіма пацее».

30. сб. *Андрэйкі.* Дзявочае свята.

Снежань

1. н. *Адвент.* Перадкалядны пост.

4. с. *Барбара.* «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла». **Увядзенне.** Водзяцца ваўкі.

5. ч. Пракоп. *Савы.* «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».

6. пт. *Мікола.* «Хвалі зіму па Міколе». **Матрыхваны.** Не пралі.

7. сб. Кацярыны. «Забрала край лета».

9. п. Юр'е Зімовы. Юра мосціць. *Ганны.* «Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні».

13. пт. Андросы, Андрэйкі. Варажылі.

14. сб. Навум. «Наставіць на вум». Пачыналі вучыць дзяцей грамаце.

17. а. Варвары. «Мікола і Варвара ноч урвалі».

18. с. Савы, Міколін бацька. «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».

19. ч. Мікола Зімовы. «Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета». «Мікола марозам гвоздзіць».

22. н. Ганны. «Ганны — прыбавіцца багата дня», «Ганкі — палічаны дзянькі».

23. п. *Зімовае сонцастаянне. Усход — 09.27, захад — 16.50. Даўжыня дня — 7.23 гадзіны.*

24. а. *Посная куцця.* Пачатак Каляд (да 6 студзеня).

25. с. *Божае Нараджэнне.* Было Новым годам. «Свята Ражаство ўпярод пашло, новы гадок павёў радок». Спірыдон Сонцаварот.

26. ч. *Сцяпан.* «Кожны сабе пан».

31. а. *Багатая куцця. Сільвестр.* Варажылі дзяўчаты. **Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка».

Алесь ЛОЗКА, фальклярыст.

Наш культурны асяродак
Жыранделя
Выпуск № 1 (443)

ПРОСТА ЛЮДЗІ. НЕ ПРОСТА ФАТОГРАФЫ

Сабраць разам работы фатографаў з розных месцаў нашай краіны — добрая ідэя. Каб убачыць нарэшце, чым жыве не толькі сталіца, але і рэгіёны. Каб паспрабаваць адчуць сапраўднае жыццё такім, якім бачаць яго мясцовыя жыхары. #дом207,595 — менавіта так называецца выстаўка, якая пачала экспанавацца ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», што месціцца ў сталічным Палацы Рэспублікі. І вы сапраўды не ўбачыце там работы мінскіх майстроў. Тым і цікавая, і па-свойму прывабная гэта экспазіцыя.

«Неба жыцця». Аляксандр Зазуля. Мазыр.

У першай зале галерэі знаходзяцца работы магілёўскіх фотамастакоў. Аднак гэта не сучасныя работы, а рэтраспектыва. Глядач убачыць здымкі, зробленыя ў 1970—1990-х гадах удзельнікамі тамтэйшых фотаклубаў. Стваральнікі гэтай экспазіцыі адзначаюць, што на розных этапах свайго станаўлення магілёўская фатаграфія мела розныя характэрныя рысы. У свой час вядучую пазіцыю займала дакументальная, публіцыстычная форма. Аднак цяпер фатаграфія займела новыя прыкметы і развіваецца ў розных напрамках: ад традыцыйнага класічнага да вобразнага, дэкаратыўнага, асацыятыўнага, ад дакументальнага рэпартажу да карціны на стыку лубка, жывапісу і графікі.

Імёны такіх фатографаў, як Зіновій Шэгельман і Павел Цішкоўскі, вядомыя не толькі ў Магілёве. Наведвальнікі выстаўкі ўбачаць работы пачынальнікаў творчай фатаграфіі горада на Дняпры. Сярод аўтараў — Аляксандр Сідлераў і Карл Янавіцкі, таксама іх паслядоўнікі — Генадзь Дондзік, Анатоль Талкачоў, Ірына Савосіна, Генадзь Карчэўскі, Аляксандр Ліцін, Мірон Шчудло і іншыя. Усе яны з'яўляюцца прадстаўнікамі магілёўскіх народных фотаклубаў «Вясёлка» і «Студыя 3 plus».

Калі крочыць па выстаўцы далей, на стыку дзвюх залаў можна ўбачыць работы гродзенкі Любові Блохавай. Яе работы прысвечаны лічбавым тэхналогіям, аднак не толькі ім. Вось што яна сама расказвае пра свае работы: «У якім бы стагоддзі ні жыў чалавек, яму заўсёды патрабуецца інфармацыя аб тым, што адбываецца ў краіне, у свеце. Чалавек адчувае прагу і да мастацкай літаратуры, якая фарміруе мастацкі густ і выхоўвае рознабаковую асобу. І яму трэба мець стасункі і з іншымі. Усё гэта стала дасяжным «тут і цяпер» дзякуючы смартфонам і інтэрнэту. Інтэрнэт — лепшае вынаходніцтва для ўсталявання зносін, для хуткага атрымання інфармацыі, дзе б чалавек ні знаходзіўся. Нават у грамадскім транспарце. Інтэрнэт — гэта лепшае, што прыдумала чалавецтва за апошні час». Натуральна, з такім меркаваннем аўтаркі можна не пагадзіцца. Бо часам інтэрнэт не толькі дапамагае ўсталяваць стасункі, але і «забірае» нас ад нашых рэальных блізкіх людзей. У сваіх невялічкіх фотападборках аўтар паказала рознасць кантактавання і баўлення вольнага часу на прыкладзе грамадскага транспарту. Хтосьці чытае газету, хтосьці сядзіць у сваім смартфоне, а хтосьці задуменна пазірае ў акно, забыўшыся пра паўсядзённае...

Яшчэ адна цікавая падборка, знятая таксама ў Гродне Аляксандрам Саенкам яшчэ ў 2008—2009 гадах, называецца «Едуны». На здымках можна пабачыць будні дабрачыннай каталіцкай арганізацыі «Карытас». У яе межах манахіні раздаюць бясплатныя абеды бяздомным і маламаёмным людзям і тым, чый прыбытак не перавышае 50 еўра. Сёстры-манахіні самі гатуюць стравы, размяркоўваюць цёплыя булкі свежага хлеба сярод тых, хто завітаў да іх на абед. Усё — дзеля дапамогі тым, хто побач, і здзяйснення добрых спраў Хрыста на гэтай зямлі, што ўдала адлюстравана на фота.

Даволі паэтычна выглядаюць работы мазыраніна Аляксандра Зазулі. Назвы яго работ «Самота неадкрытасці», «Святло ў акне» гавораць самі за сябе. На іх сапраўды бачыцца даволі маляўнічая сцяна, рамантычнае акно ў драўлянай ліштве. А вось работа «Неба жыцця» ўвогуле надзвычай арыгінальная. На фоне сіняга неба выяўлены... звычайныя камары. Аказваецца, яны хмарамі раяцца над Прыпяццю ў маі-чэрвені і пры гэтым зусім не кусаюцца. Дарэчы, камары на гэтым палатне нагадваюць хутчэй белыя дзьмухаўцы, якія ўзляцелі да нябёс.

Адна з самых моцных серый выстаўкі — падборка Алены Ярашэвіч з Асіповіч пад назвай «Проста людзі». Гэта праект пра звычайных вяскоўцаў, якія працуюць на зямлі. «Земляробы. Сяляне. Працаўнікі... Часта пра іх кажуць зняважліва «калгаснікі». Часам наўмысна-пафасна — «соль зямлі». Проста людзі», — так тлумачыць канцэпцыю сваіх работ сама аўтар. Яе фотаздымкі чапляюць рэалістычнасцю, прастатой. У іх паказана тое, што мы прызвычаіліся не заўважаць, але на што варта было б звярнуць увагу...

Дарэчы, 207 595 кіламетраў — такая плошча Беларусі. Таму выстаўка і атрымала адпаведную назву #дом207,595. За гэтымі лічбамі — шум вялікіх гарадоў і цішыня маленькіх вёсак, людзі, якія там жывуць, іх побыт, дарогі, якімі яны ходзяць. Адным словам, гэта жыццё, якое і стала галоўнай тэмай экспазіцыі.

— Гэтай выстаўкай мы спрабавалі паказаць, як развіваецца сёння сучасная нацыянальная фатаграфія, — расказвае куратар — фотограф Марына Бацюкова. — Культурнае жыццё краіны не сканцэнтравана толькі ў Мінску. У іншых гарадах Беларусі працуе шмат таленавітых, удумлівых аўтараў, работы якіх трэба паказваць шырокай аўдыторыі.

Выстаўка будзе працаваць да 21 студзеня і адкрыта для наведвання.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

З серыі «Едуны» Аляксандра Саенкі. Гродна.

M@RT КОНТАКТ
21-27 марта

У Магілёў едзе M@rt.кантакт

Квіткі на прадстаўленні папулярнага міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форуму, які па традыцыі пачнецца з 21 сакавіка і закончыцца ў міжнародны дзень тэатра 27 сакавіка, паступяць у продаж ужо на наступным тыдні — 15 студзеня. Як паказвае практыка, большая іх частка раскупляецца ўжо ў першыя дні. Фестывальная афіша абяцае быць насычаная і цікавая. У асноўнай праграме форуму 23 спектаклі і тэатральныя праекты 23 тэатраў з 10 краін свету. Госці прыедуць з Беларусі, Расіі, Грузіі, Латвіі, Арменіі, Украіны, Ізраіля, Прыднястроўя, Польшчы, Літвы.

— Мы запрасілі як новыя калектывы, так і тыя, чыя творчасць спадабалася магіляўчанам — гэта тэатр «Майстэрня» і «Невялікі драматычны тэатр» з Санкт-Пецярбурга, — расказаў **дырэктар Магілёўскага абласнога тэатра Андрэй НОВІКАЎ.** — З цікавых асоб, якія далі згоду на ўдзел у фестывалі, мы чакаем вядучых рэжысёраў і педагогаў — Льва Эрэнбурга, Рыгора Казлова, заслужаную артыстку Арменіі Нарынэ Грыгаран з бліскучым монаспектаклем. Да нас прыедзе Вялікі тэатр лялек з Санкт-Пецярбурга са сваім натхняльнікам — галоўным рэжысёрам Русланам Курашовым. Ён вязе пастаноўку «Чужы» паводле аднайменнай аповесці Альбера Камю.

Наогул, у праграме шмат класікі: Чэхаў, Мальер, Гогаль, Шварц, Шэкспір. Але гэта новыя прачытанні вядомых нам тэкстаў: падзеі там часцей за ўсё падаюцца гратэскна, нават карыкатурна.

Традыцыйна ў рамках форуму адбудуцца майстар-класы, будзе працаваць майстэрня маладой рэжысуры, пройдуць абмеркаванні пастановак з удзелам вядучых тэатразнаўцаў. Упершыню будзе прадстаўлена аж тры спектаклі на беларускай мове — гэта «Рэвізор» знакамітых рэжысёраў Мікалая Пінігіна і Дзмітрыя Цішко ў выкананні артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, пастаноўка маладога рэжысёра Камілі Хусаінавай «Жоўты пясочак» па матывах аповесці Васіля Быкава, дзе ролі выконваюць артысты Магілёўскага драмтэатра, і «Паляванне на сябе» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

Застаецца дадаць, што цана білетаў у гэтым годзе складае ад 10 да 35 рублёў. Набыць іх можна і праз інтэрнэт — на сайце драмтэатра размешчана спецыяльная спасылка.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Асоба

ЖЫЦЦЁ — ТВОРЧАЕ, ХАРАКТАР — БЕЛАРУСКІ

Эмацыянальнае слова чытача напярэдадні 80-годдзя народнага мастака Беларусі Васіля Пятровіча Шаранговіча

ПРЫЗНАЮСЯ, што мне даўно хацелася выказацца наконт творчых набыткаў народнага мастака Беларусі, заслужанага дзеяча культуры Польшчы, прафесара Васіля Пятровіча Шаранговіча. Бо гэтыя набыткі ўяўляюцца мне найперш тым эмацыянальным водарам і той эмацыянальнай сілай, якую я ў любой творчасці цаню найбольш. Яны валодаюць такой адметнасцю, якая ніколі не губляе каштоўнасці, наадварот, з часам толькі загартоўваецца і набывае яшчэ большую вартасць і значнасць. Мне ж, акрамя сапраўды высокага майстэрства, бачыцца і пэўная звыкласць, натуральнасць, але такая, якая даецца не кожнаму, разглядваць, сузіраць якую хочацца зноў і зноў. Бо гэта тое рэальнае жыццё, якое бачыў я і ў сваім дзяцінстве, і пазней, бачу і сёння — як сведчанне народнага побыту, як адметнасць беларускага характару.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Найперш у кніжных працах мастака столькі цеплыні, натуральнасці, настраёвасці, што не адвесці вачэй.

І гэта не юбілейнае перабольшанне. Гэта маё стаўленне да створанага Васілём Пятровічам на ніве мастацкага ілюстравання кніг альбо, кажучы прафесійнай мовай, на ніве кніжнай графікі. На шчасце, гэтая ніва сталася для Шаранговіча тым творчым полем, якое дало багаты ўраджай і добры ўмалот. Гэта набытак і самога мастака, і каштоўны падарунак нам, чытачам.

ДУМАЮ, што ў кожнага мастака ёсць жаданне, каб ягоная праца была даступна як мага большай колькасці людзей. Ды часта жаданне і рэальнасць ідуць паралельнымі шляхамі, не заўсёды перасякаюцца. Аднак ёсць такая катэгорыя мастакоў, вынікі працы якіх ад самага запачаткавання «асуджаны» на тое, каб іх бачылі тысячы людзей. Я маю на ўвазе мастакоў-кніжнікаў — тых, хто валодае рэдкім талентам мастацкага афармлення кніг. Бо калі іншыя творы мастацтва ў сваёй большасці даступныя толькі ў выставачных залах і музеях, то з вынікамі працы ілюстратараў (праўда, гэтае слова мне не надта падабаецца, бо ў ім гучыць нейкая другаснасць, а я цвёрда лічу, што мастак-ілюстратар — самы сапраўдны і рэальны сутворца, суаўтар кнігі) могуць, не выходзячы з кватэры ці хаты, знаёміцца (сузіраючы іх зноў і зноў) многія і многія тысячы чытачоў. Ці не таму кожнае выдавецтва імкнецца, каб у яго тэматычных планах былі выданні, якія вызначаліся б высокай мастацкасцю. На шчасце, такімі шэдэўральнымі, кажучы сённяшняй мовай, кнігамі можа пахваліцца і Беларускі фонд культуры. Яны не сталі б такімі, калі б да іх афармлення-ілюстравання не далучыўся Васіль Пятровіч Шаранговіч.

Я маю на ўвазе найперш «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча і «Новую зямлю» Якуба Коласа — абедзве на беларускай, рускай і польскай мовах. Што я не перабольшваю, што не завышаю ацэнак у дачыненні да мастацкага ілюстравання гэтых выданняў, сведчаць і многія ўзнагароды на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. А яшчэ я чуў шмат ухвальных слоў на адрас мастака Шаранговіча з вуснаў многіх дыпламатаў замежных краін, калі праводзіў прэзентацыю «Пана Тадэвуша», будучы паслом Беларусі ў Румыніі.

